Пралетары ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 24 (480) | Субота, 17 жніўня 1940 года | Цана 20 кап.

НАПЯРЭДАДНІ ТЭАТРАЛЬНАГА СЕЗОНА

Тэатры Совецкай Беларусі адкрываюць новы сезон свайго абшчэння з гледачом, сваёй творчай дзейнасці. Пачынаецца новы этап росту, узбагачэння тэатральнага мастацтва нашай рэспублікі. На гэтым этапе творчага развіцця перад тэатрамі БССР, як і перад совецкім мастацтвам у цэлым, стаіць велічная, грандыёзная задача—задача стварэння класічных твораў нашай эпохі. Належнае вырашэнне калектывамі мастацтваў гэтай пачэснай задачы падрыхтоўваюць здабытыя поспехі. Ярчайшай дэманстрацыяй гэтых поспехаў—творчай спеласці, выдатных здабыткаў беларускага мастацтва—з'явілася дэкада беларускага мастацтва ў Маскве, у часе якой партыя і ўрад далі надзвычай высокую ацэнку творам і рабоце майстроў мастацтваў БССР.

Спектаклямі, якія дэманстрыраваліся на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве, пачынаюць сезон лепшыя тэатры рэспублікі—Дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балета, Дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга беларускі драматычны тэатр. Гэта — справаздача лепшых тэатральных калектываў перад працоўнымі Совецкай Беларусі аб бліскучых выніках дэкады, аб цудоўным росквіце беларускага мастацтва. І на чарзе—далейшая напружаная творчая работа.

Калектывы Опернага і Драматычнага тэатраў мяркуюць паказаць на сваёй сцэне рад твораў класікі. Оперны тэатр—творы Пучыні, Чайкоўскага, Драматычны—Лопе дэ Вега і, упершыню на беларускай сцэне, Шэкспіра.

Але нельга забываць асноўнага—нельга паслабляць сувязі з драматургамі, лібрэтыстамі, кампазітарамі, узбагачэння рэпертуара арыгінальнымі творамі. Між тым пэўны заняпад гэтай справы ёсць. Доказамі такому абвінавачванню можа служыць праектыруемая адцяжка на значны тэрмін пастаноўкі наяўнай ужо ў рэпертуарным партфелі оперы «Кацярына» Н. Шчэглова Тэатрам оперы і балета, адсутнасць новых арыгінальных п'ес у партфелі Белдзярждрамтэатра. Такое становішча патрабуе, перш за ўсё, сур'ёзнага ўмяшання Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР у практыку работы тэатраў зараз, напярэдадні тэатральнага сезона.

Узбагачаныя вялікім вопытам работы над арыгінальнымі творамі ў часе падрыхтоўкі да дэкады, Оперны і Драматычны тэатры, а разам і ўсе тэатральныя калектывы рэспублікі, павінны ўзмацніць цягненне да арыгінальнага рэпертуара, умацаваць і пашыраць свае сувязі з драматургамі і кампазітарамі.

Ад слоў да справы—сур'ёзнай, удумлівай, творчай сувязі з беларускімі драматургамі—павінны перайсці і іншыя тэатры рэспублікі, у прыватнасці Драматычны рускі, абласныя, калгасныя тэатры. Дарэчы трэба адзначыць, што гэтыя тэатры, за невялікім выключэннем, сапраўдных клопатаў аб набыцці арыгінальнага рэпертуара, наогул, дагэтуль не праяўлялі, арыентуючыся выключна на «модны» рэпертуар. А разам з тым адзначым наяўнасць рада п'ес беларускіх драматургаў, якія заслугоўваюць гонару быць на сцэне і ўсё-ж не пастаўленых. Такое становішча можа з'явіцца сур'ёзным тормазам у плённым далейшым развіцці нашага тэатральнага мастацтва. Гэта трэба ўлічыць і кіраўнікам тэатраў і Упраўленню па справах мастацтваў.

Новы сезон, які адкрываюць тэатры Совецкай Беларусі, павінен з'явіцца і новым этапам удасканалення майстэрства творчых калектываў. Узбагачаць свой творчы вопыт, дзейсна змагацца за трыумф соцыялістычнага рэалізма ў мастацтве павінны тэатральныя калектывы. А гэта барацьба за стыль совецкага тэатра патрабуе ад кожнага рэжысёра і актора няспынных творчых пошукаў, дзярзанняў. Як узор у гэтым, варта прыгадаць творчасць выдатнага актора рускай сцэны Остужэва, створаны ім на сцэне Малага тэатра вобраз Урыэля Акосты, вобраз авеяны рамантыкай,—той рамантыкай, якая ўзбагачае нашу барацьбу за вялікае класічнае мастацтва соцыялістычнай эпохі.

У новым сезоне перад тэатральнымі калектывамі паўстаюць надзвычай вялікія і адказныя задачы арганізацыйнай перабудовы.

Указ Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня 1940 года адкрывае вялікія магчымасці ўздыму прадукцыйнасці працы, мастацкай якасці спектакляў пры адначасовым пашырэнні культурнага абслугоўвання працоўных і скарачэнні выдатковага бюджэта тэатраў. Выданы на аснове Указа загад Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР стварае ўсе ўмовы для ўмацавання працоўнай дысцыпліны ў тэатрах, павелічэння колькасці спектакляў і колькасці новых пастановак, а разам з тым памяншэння выдаткаў.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, накіраваны супроць прагульшчыкаў, летуноў, дэзарганізатараў працы, павінен выконвацца з усёй суровасцю і непрымірымасцю да парушальнікаў яго ў кожным калектыве работнікаў мастацтваў.

Партыйныя, комсамольскія, профсаюзныя арганізацыі тэатраў павінны забяспечыць няўхільнае выкананне Указа і перабудову работы на аснове загада Камітэта.

Совецкая мастацкая інтэлігенцыя павінна паказаць прыклад дысцыплініраванасці, барацьбы за прадукцыйнасць і ўздым якасці сваёй работы.

Рэалізацыя Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня забяспечвае бліскучыя поспехі чарговага тэатральнага сезона.

Змагацца за высокую ідэйную і мастацкую вартасць новых работ, за ўзбагачэнне мастацтва выдатнымі творамі совецкай класікі—абавязак усіх калектываў работнікаў мастацтваў Совецкай Беларусі.

ВЫДАТНЫЯ ПІСЬМЕННІКІ БУКАВІНЫ

Вітаю і цябе, мая родная, горам апавітая, зялёная Буковіна, з якой выйшлі вялікія пісьменнікі Юрый Федзьковіч і Ольга Кабылянская.

(З выступлення дэпутата Студзінскага К. О. на Сёмай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР 1-га скліканя).

Самым яркім прадстаўніком украінскай літаратуры ў Букавіне з'яўляецца Осіп-Юрый Федзьковіч (1834—1888 г.), сын гуцульскіх гор, добры знаўца народнага быту.

Просты стыль, прыгожая народная мова—вось што характэрна для творчасці Федзьковіча.

Першыя яго вершы, надрукаваныя ў Львове, былі з захапленнем прыняты не толькі ў Букавіне, але і ў Галіцыі.

Федзьковіч пісаў вершы і апавяданні, якія зрабілі яго імя вядомым на Украіне, а таксама далёка за межамі яе. Да лепшых апавяданняў належаць: «Люба-згуба» (1862), «Стралец» (1863 г.), «Італьянка» (1864 г.), «Сафат Зініч», «Набрацім» і іншыя (1865 г.).

Таленавіты букавінскі пісьменнік вельмі многа зрабіў для культурнага адраджэння свайго народу. Ён быў рэдактарам першай украінскай газеты ў Чэрнаўцах—«Букавіна», арганізаванай у 1884 годзе.

Ольга Кабылянская займае выдатнае месца ва украінскай літаратуры. Вялікі пісьменнік Іван Франко глыбока паважаў Ольгу-Кабылянскую і з высокай пахвалай гаварыў аб яе творах, называючы іх «бліскучымі алмазамі украінскай мастацкай літаратуры».

Аднак у баярскай Румыніі творы пісьменніцы Кабылянскай не друкаваліся. Двойчы ў яе доме паяўляліся агенты тайнай паліцыі—сігуранцы, рабілі вобыскі, але, не знайшоўшы нічога, апрача яе цудоўных кніг, выданых за граніцай, бралі з сабою рукапісы яшчэ недрукаваных яе твораў.

Пісьменніца Кабылянская нарадзілася ў 1865 годзе. У часе захвату Румыніяй Букавіны ёй было 53 гады, зараз ёй—75 год. Амаль трэць свайго жыцця яна пражыла ў Букавіне, у гэтым прыгнечаным, абяздоленым краі.

Юнацкія годы Ольгі Кабылянскай прайшлі ў невялікім правінцыяльным горадзе, у нямецкім асяроддзі. Не дзіва, што яе першыя юнацкія творы напісаны на нямецкай мове. Толькі крыху пазней, пасля знаёмства з пісьменнікамі Украіны, маладая Кабылянская пачынае пісаць па-украінску.

Гэта было не толькі змяненне мовы творчасці. Не! Гэта быў глыбокі працэс нараджэння нацыянальнага самаўсведамлення пісьменніцы, якая знайшла сябе. Гэта быў глыбока прагрэсіўны для творчасці пісьменніцы крок, бо ніводзін мастак не можа даць высокамастацкія творы, калі ён не звязан кроўна са сваім народам.

Творчасць Кабылянскай не карысталася поспехам у тупых буржуазна-нацыяналістычных крытыкаў. Але яна шырока і добра вядома масаваму чытачу, які любіць і разумее творы пісьменніцы.

Яе першая вялікая аповесць «Царэўна» надрукавана ў 1896 годзе ў газеце «Букавіна». Там-жа паявіліся і першыя выдатныя навелы Кабылянскай («Прыгоды», «Мужык», «Некультурная», «Бітва»), якія былі да таго моцныя і арыгінальныя, што іх аўтар адразу становіцца адным з папулярнейшых навелістаў.

У 1927 годзе споўнілася 40 год літаратурнай дзейнасці Ольгі Кабылянскай. Юбілей пісьменніцы скромна адзначыла група яе сяброў. І толькі Масква горача і адкрыта павіншавала пісьменніцу з юбілеем. Ёй вызначылі літаратурную пенсію. Дапамога з краіны Советаў была не толькі матэрыяльным, але і маральным падтрыманнем пісьменніцы.

22 годы Ольга Кабылянская была адарвана ад роднай Совецкай Украіны. Яе мары сталі сёння рэчаіснасцю.

Осіп-Юрый Федзьковіч

ДУМКІ

Баліць мая галованька,
А з чаго — не знаю;
Звязаў-бы я хустачкай,
Хустачкі не маю.
Пусціў сваю хустачку
На мора, на мора;
Плыві, мая хустачка,
У горы, у горы.
Выйдзе маці ваду браць
Дый мяне спаймае.
І пачне яна пытаці:
— З якога ты краю?
Адкажы ёй, барвяная:
— «Ад сына даслана».
— «А чаму ты, — запытае, —
Кроўю фарбавана?»
Адкажы ёй, хустачка:
— «То царская слава
Фарбуе заўсёды
Крывава, крывава».

II.

Ой жаўнер я, хлопцы,
Ой жаўнер, жаўнер.
Калі вы не верыце
Гляньце на каўнер.
Які-ж ён прыгожы,
Які-ж светлы, ясны,
Чысты, акуратны...
Толькі я няшчасны.
Ці можа ты, мама,
Не біла паклоны,
Пірог не панесла
Кумам па закону.
Што яны мне злую долю —
Кайданы судзілі?
Бадай-жа вас, бацька-маці,
Ды злыдні пабілі!
На гары высокай
Крутыя дарогі.
Не знаеце, бацька-маці,
Як самлелі ногі,
Блукаючы з кайданамі
Ад краю да краю.
Гэй, пайду я, бацька-маці,
З канём да Дунаю.
Там сарву я ўсё жалеза
І ў раку закіну,
Ды на коніку памчуся
К маці праз даліну.
А ў матулечкі старэнькай
Хата на памосце.
Калі з доляй не загіну,
Дык буду за госця.

Пераклаў з украінскай Р. КАЗАК.

Ольга Кабылянская

МУЖЫК

Колькі разоў чую палкавую музыку і ўсё ўспамінаецца мне адна прыгода з маладых год. Гэта было ў адным вялікім горадзе ў месяцы жніўні, і якраз апоўдні.

Я знаходзіўся ў кампаніі польскіх дам і аглядаў прыгожыя ручныя работы, якія яны мне паказвалі. Былі гэта па-майстэрску і з вялікім густам выгаптаваныя на цёмнай аксамітнай аснове гірлянды кветак, кістак і арабесак.

Я гаварыў ім колкія фразы, выказваў сваю дасціпнасць, а яны «калолі» мяне.

Адна з іх, панна Ванда (у яе былі тонкія далікатныя рукі) гаварыла дужа багата пра асвету, пра гуманнасць, пра пачуцці, яна амаль заўсёды стаяла са мной на ваенным парадзе і звала мяне жартам: Гайне.

Да сёнешняга дня не ведаю, што прымушала мяне траціць з ёю столькі часу...

. . . . . .

Жартуючы і смеючыся, пачулі аднаго разу палкавую музыку. Панна Ванда мятнулася, нібы матыль, да шкляных дзвярэй, схаваных за цяжкімі плюшавымі драпер'ямі; і мы выйшлі на балкон, пагляданючы з вясёлай цікавасцю на ўсе бакі ў далеч.

З адной узбочнай шырокай вуліцы высыпалася пад гукі музыкі цёмная, правільная і роўна ступаючая, доўгая маса людзей — войска.

Звычайна сінія, а цяпер запыленыя блузы і уніформы здаваліся сівымі. Сонцам апаленыя, ад стомы і голаду пацямнелыя, твары людзей выдаваліся мне амаль што чорнымі.

Хада гэтай масы — аднастайная, важкая, механічная, якаясьці характэрная, і як цяжка яе забыць!! Не, якраз цяпер не былі гэта людзі. Гэта быў нейкі матэматычна ў адно складзены механізм, душой якога быў сухі такт музыкі. Ён кранаў і рухаў усё наперад, гэта — цэлая справа майстэрства і муштры.

Адзін-адзінюсенькі член таго механізма, у самым апошнім радзе аднаго падраздзялення, не выконваў сваёй задачы. Чалавек той быў меншы і слабейшы за сваіх таварышоў, не трымаў ці не мог з імі кроку трымаць і, застаючыся на крок ззаду іх, кульгаў.

Мае вочы спыніліся на яго велічэзных, грубых, ад сухаты парыжэлых скураных чаравіках і я ўявіў сабе на яго назе глыбокую рану. Гэтае ўяўленне выклікала ў маіх думках шмат прыкрых успамінаў з вайсковага жыцця. Я ўспомніў увесь цяжар і ўсю суровасць яго. Успомніў грубасць ваенных настаўнікаў, грубасць — амаль казачную, а да ўсяго гэтага — невыказную пакуту простага, да вайсковай службы нязвычнага, да свабоды прывыкшага селяніна: яго жаль і тугу ў сваім ціхім і простым свеце,—і мяне зацікавіў твар няздатнага ваякі.

На ім павінна быць штосьці вызначана, нейкае пярпенне, атупенне, або, можа, нямая упартасць? Аднак, сонца пякло так моцна, што я прыжмурыў на хвіліну вочы і, засланяючы іх рукою, бачыў толькі, як ён насілу валок за сабою балючую нагу...

— Што за прыгожы малюнак!—крыкнула полька з энтузіязмам.

— Ах, Ванда... Ён там, на чале апошняга падраздзялення, бачыш таго афіцэра з узнятай шабляй? Ох, няхай-бы так ішлі ўсе нашы на нашых ворагаў... Ох, Ванда!

— Бачу, Ядвіга. Аднак, не заўважаеш? Увесь малюнак наганінь кульгаючы ў апошнім радзе хам!

Уся кроў бухнула мне ў твар, і я паглядзеў на іх. На прыгожых свежых вуснах трымцела яшчэ пагардлівая ўсмешка, а вочы панны Ванды — вялікія мігцеючыя зоры — глядзелі халодным позіркам у даль.

У маіх руках быў яшчэ «Конрад Валенрод». Раман гэты, ідучы на балкон, забыў я пакласці на стол. Я шпурнуў ім, не разумеючы, з якогасьці раптоўнага, амаль бурлівага, раздражнення, паням пад ногі і, пакланіўшыся з усмешкай нянавісці, павярнуў да дзвярэй.

Пані Ядвіга затрымала мяне ўладным рухам.

— Не ведаю, мой пане, якога роду думкі завалодалі вамі ў тую хвіліну, — сказала горда, з ледзяным спакоем. — Аднак, якое вы маеце права забываць, што знаходзіцеся ў нашай кампаніі?

— У чыёй кампаніі? — спытаў я.

— У кампаніі полек! Не забывайце гэта на другі раз!

У адказ я толькі схіліўся іранічным паклонам і пайшоў.

Але ніколі... і да смерці — не! — не забуду тону, якім прагучэлі сказаныя ўслед мне словы:

— То хлоп, Ядвіга...

— Русін, Ванда!..

Осіп-Юрый Федзьковіч

САФАТ ЗІНІЧ

Я сабе ўжо не раз вось так сяджу ды думаю: як от, па бедным свеце, няшчаснага рэкрута б'юць ды здзекуюцца пры той навуцы. А мяне, бывала, і пальцам ніхто не кране, не толькі што. Але-ж я і прызвычаіўся хутка да тае муштры. Бывала, капрал мне чаго-б не паказаў, а я ўжо гэтак і зрабіў. А пан маёр наш так і вырашыў:

— Табе,—кажа,—не пры вярбоўцы мучыцца; хутка на муштру пойдзеш, у полк.

Вось і пайшоў.

Наш полк стаяў тады аж у Банаце, далёка. Бадай што два месяцы маршыравалі, пакуль зайшлі.

Мяне паслалі ў грэнадзёры ў першую роту, трэці ўзвод, які па кватэрах стаяў. А добрыя кватэры мелі! Усе ў сербаў: багацеі, ведаеце. Там багаты край, не такі, як у нас.

А мне загадаў капрал ісці на кватэру з адным старшым жаўнерам. Сафатам Зінічам зваўся. Божухна, што за ваяка слаўны з яго ўдаўся! А што ганарысты быў, дык і не сказаць: чысты букавінец. Я, бывала, баяўся яго, як якога-небудзь афіцэра, ці што. Такі ўжо ён быў, гэты Зініч; і ў вочы яму страшна глянуць.

А мы мелі кватэру ў адной удавы. Казалі, што калісьці яна і багацейка была, ды на старасці год давялося збяднець. Слабая была, часта ляжала. А дзетак не было ў яе, толькі адна дзяўчына, Марта ёй звалася, маладзенькая ды ціхая сабе, як тая птушка пявюшка ў лесе. Як, бывала, глянеш у вочы яе спакойныя і ціхія, або ў тварык бледны, змучаны, дык ажно ледзь не самлееш: такая ўжо гаротная была!

Ва ўдавы жылі мы, як у сваіх родзічаў. І хлеб нам быў адзін, і солі ніхто ад нас не хаваў. Сафат, бывала, і дроў купіць (ён меў, ведаеце, грошы яшчэ з дому), і скаромнага раздабудзе, што трэба. Бедную ўдаву вельмі шкадаваў. А я ўжо і дроў насяку, і вады прынясу, і скрозь дагляджу, як трэба, каб гэта, ведаеце, дзяўчыне лягчэй было. А яна, мая рыбанька, бывала аж плача:

— Ці гэта вас,—кажа,—бог з неба да нас, бедных, паслаў, ці што?

Адразу яшчэ, як мы там былі на кватэры, дык хадзіў адзін маладзенькі сербіянчык, Янкам зваўся; прыгожы хлапец. А што ўжо кахала яго наша ціхенькая Марта, дык, мабыць, і ў спяванках няма таго. Як яго, бывала, аднаго вечара не бачыць, дык і не вячэрае,—выплача любыя свае вачаняткі, аж нам яе шкада стане. А яны былі ўжо заручаныя, бо там, ведаеце, такі ўжо звычай, што два або і тры гады наперад сабе слова даюць, а потым і пойдуць да шлюбу.

А Янка хадзіў спачатку, хадзіў, а пасля нераставаў хадзіць. Казаў ён, што выбіраецца за Дунай у купецтва. Нарэшце, ужо і не прыйшоў. Паехаў, мабыць.

Аднаго дня ідзём мы са сходу, аж чуем: из нашай кватэры гоман. Прыбягаем; аж тут ужо ўсе суседзі мітусяцца каля няшчаснай Марты, якая ўжо мёртвая на падлозе ляжыць, нібы тая ластаўка забітая. Мы зараз пачалі пытаць, што гэта за няшчасце здарылася, як нас не было ў доме. А людзі ўсё акурат раскавалі:

— Янка,—кажуць,—адаслаў ёй пярсцёнак, высватаў сабе другую, багацейку, у Васіля Карадзіча, калі ведаеце.

— Ці так?—кажа Сафат, а сам апусціў свае сакаліныя вочы ў зямлю.

Нічога больш не сказаў.

Трэцяга дня пахавалі і Марту, і старую, а самі пайшлі на другую кватэру.

Праз два тыдні пайшлі чуткі на сяле: Карадзіч дачку выдае, а Янка ходзіць з дружкамі з хаты ў хату, ды збірае сабе баяраў, запрашае гасцей на вяселле.

Увечары збіраецца і Сафат.

— А вы куды гэта?—пытаю.

— На вяселле,—кажа:—ідзі прынясі мне добрага віна вядро ды пірог!—а сам кінуў мне чырвонец.

Я пабег. Прыходжу, а Зініча ўжо няма, пайшоў. «Што тут рабіць?»—думаю я сабе. Бяру віно, ды бягу за ім. А ў Карадзіча—крык ды лямант на двары!

— А што там такое?—пытаю ў людзей.

— Сафат Зініч застрэліў маладога,—адказваюць.

— А дзе-ж ён,—кажу,—Зініч гэты?

— Пайшоў сам да арышту,—кажуць.

Закулі арыштанта ў жалеза ды аддалі ў турму. Асудзілі няшчаснага на дзесяць год цяжкай няволі. Я праводзіў яго аж за горад, ды так мне было шкада хлопца!

— Браточку, таварыш мой дарагі ды любы: навошта во гэтак марна гінеце?..

— За праўду, таварыш,—прамовіў, як у звон ударыў, а сам і не скрывіўся.

Вельмі-ж добры быў жаўнер.

ДА ПЕРШАЙ ГАДАВІНЫ ВЫЗВАЛЕННЯ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

17-га верасня 1940 года—першая гадавіна з дня вызвалення Заходняй Беларусі ад белапольскага ярма. Увесь беларускі народ дзейсна рыхтуецца да гэтай вялікай гістарычнай даты. Пісьменнікі заходніх абласцей БССР сустракаюць гэта вялікае свята беларускага народа новымі песнямі, паэмамі, апавяданнямі, аповесцямі і раманамі, якімі яны ўслаўляюць веліч сталінскай эпохі, дзякуюць большэвіцкай партыі і совецкаму ўраду за сваё вызваленне. У сваіх творах яны расказваюць нам аб пакутах працоўнага народа пад ігам панскай Польшчы на працягу доўгіх год, аб ажыццяўленні заветнай мары народа—далучэнні да шчаслівай Совецкай Беларусі.

Ніжэй мы друкуем пісьмы паэтаў і пісьменнікаў заходніх абласцей, у якіх расказваюць, якімі творчымі поспехамі сустракаюць яны слаўную гадавіну вызвалення Заходняй Беларусі.

Максім ТАНК

„Бура над Нараччу“

Працуючы ў вілейскай абласной газеце, я напісаў рад вершаў, якія друкаваліся ў мінскіх газетах і журналах. Гэта — вершы аб вызваленні Заходняй Беларусі, аб выбарах у Вярхоўны Совет. У Дзяржаўным выдавецтве мае хутка выйсці з друку кніга маіх выбраных твораў.

У маі месяцы, будучы ў Ялце ў доме адпачынку, я напісаў сцэнарый «Бура над Нараччу» — аб паўстанні нарачанскіх рыбакоў супроць панскага прыгнёту.

У бягучым годзе мне прадстаіць такая работа: аднавіць усе выкрэсленыя польскай цэнзурай вершы з паэмы «Нарач», нанава пераапрацаваць «Казку пра Музыку» і закончыць паэму «Сілаш», якую я пачаў пісаць яшчэ ў 1938 годзе ў Вільне. У гэтай паэме я раскажу пра змаганне беларускага народа з белапольскімі акупантамі і іх прыхваснямі — беларускімі нацдэмамі.

Іосіф ОКРУТНЫ

Кніга аб Тойв'е Айзн

Уся мая творчасць да гэтага часу была пранікнута глыбокім уздыхам, хоць голас пратэсту ніколі не сціхаў у маіх апавяданнях. Дом, маленства, сям'я былі цяжкімі і безрадаснымі. Не выпадкова першая мая кніга называецца «Хлеб наш насушны». Яна з першага-ж погляду не спадабалася польскай уладзе і была канфіскавана. Цэнзуру ўстрывожыла сама тэматыка — яўрэі-ткачы, бунтуючыя супроць сваіх эксплаататараў. У рамане «Дом у старым горадзе» я паказваю распад дробнабуржуазнай сям'і ў гнілым капіталістычным акружэнні.

У бліжэйшую маю творчую неадкладную задачу ўваходзіць напісанне кнігі аб жыцці і барацьбе маладога лодзінскага рэвалюцыянера Тойв'е Айзн, які загінуў у Іспаніі за свабоду народа. Я хачу стварыць кнігу, дастойную памяці гэтага непахіснага мужнага барацьбіта і роднага мне чалавека.

Міхаіл БУРШТЫН

„Ля рэк Мазоўя“

У былой Польшчы выдаў некалькі кніг прозы. Найбольш вядомы «Руіны мястэчка», «Лёс», зборнік апавяданняў пад назвай «Хлеб і соль».

У Беластоку напісаў два вялікіх апавяданні: «Таварыш дырэктар» і «Новае свята» на тэмы совецкай рэчаіснасці.

У маскоўскім выдавецтве «Дэр Эмес» выходзіць мой раман «Ля рэк Мазоўя». Гэты раман і некалькі апавяданняў перакладаюцца на рускую мову.

Зараз пішу другі том рамана «Ля рэк Мазоўя», у якім мае героі становяцца ўжо совецкімі грамадзянамі.

Елена СЭЛЬМ

„Ты, я і ўвесь свет“

Здараецца, што тэма перарастае вызначаныя пісьменнікам граніцы. Так здарылася са мной. Хутка дзяржаўнае выдавецтва выдасць маю першую ў Совецкім Саюзе, а трэцюю ў жыцці кнігу. Гэта—зборнік апавяданняў аб жыцці ў панскай Польшчы. Адно з апавяданняў вышла з рамак навелы. Я пачала працаваць над аповесцю, якую нядаўна скончыла—«Ты, я і ўвесь свет». Гэта—жыццё жанчыны ва ўмовах капіталістычнага грамадства.

На чарзе кніга для дзяцей.

Іцхок ЯНАСОВІЧ

Паэма аб Чырвонай Арміі

Першую гадавіну вызвалення сустракаю новай паэмай аб нашай слаўнай Чырвонай Арміі, вызваліўшай народы Заходняй Беларусі ад белапольскай акупацыі.

Бінэм ГЕЛЕР

Вершы аб радасці вызваленага чалавека

З юнацкіх год я рабочы-пярчатачнік. З самага пачатку сваёй дзейнасці я ўяўляю творчасць неразрыўнай з рабочым класам, з комуністычнай партыяй. Таму на совецкую тэрыторыю я прыйшоў не як госць і не як спачуваючы. Ужо ў першыя дні я напісаў вершы аб радасці вызваленага чалавека.

У капіталістычным грамадстве я перажыў усе пакуты рабочага, беспрацоўнага, галадаючага і вымушанага эмігранта. Два прадапошніх годы я жыў у Парыжы, дзе раздзяляў лёс выгнаннікаў, якім не давала жыцця паліцыя. «Дэмакратычная» Францыя Блюма — Даладз'е не была гасціннай. Пакуты свайго выгнання я перадам у паэме, над якой зараз працую.

У бліжэйшы час пачну работу над паэмай аб новай радаснай сапраўднасці, бо немагчыма не рэагаваць на падзеі вялікай гістарычнай важнасці, сведкамі якіх мы цяпер з'яўляемся штодзень.

Яніна БРАНЕЎСКАЯ

„Вандроўкі меднага грошыка“

Для нас, пісьменнікаў, якіх увесь час трымала ў ціскох польская цэнзура, з таго дня, як мы апынуліся на совецкай зямлі, настаў новы, сапраўды творчы перыяд. Усё тое, што трэба было хаваць між радкоў, зараз мы выказваем адкрыта.

Мая апошняя кніга «Вандроўкі меднага грошыка» вядзе чытача па капіталістычнаму грамадству, паказвае сапраўднае аблічча гэтага грамадства. І я хачу, каб апошні раздзел кнігі, які паказвае вялікую перамену ў нашым жыцці, з'явіўся сапраўды шчаслівым фіналам.

Аднак, я не забываюся на такую цяжкасць: у творы для дарослых пісьменнік малюе адмоўных персанажаў аб'ектыўна. За іх гавораць іх думкі, пачуцці, учынкі. Дзіця-ж трэба навесці на ацэнку кожнай з'явы. Калі «навядзеш» вельмі моцна — пацерпіць ідэйны ўзровень і творчая якасць кнігі, не выхаваўчае значэнне. Неабходнасць «лавіравання», заўсёднага пачуцця меры патрабуюць ад пісьменніка дасканалага ведання дзіцячай псіхалогіі.

Я лічу, што для дзіцячага пісьменніка творчай лабараторыяй павінна служыць совецкая школа, непасрэдная сувязь з дзецьмі.

Чысты рэалізм не заўсёды вабіць юнага чытача. Дзіцячы пісьменнік павінен ствараць персанажы, блізкія дзіцяці, для фантазіі якога не будзе нерэальным, калі з ім, скажам, размаўляе лялька, самастойна думае, назірае, робіць вывады.

У другім томе свае кнігі «Гісторыя тачонага дзеда і маляванай бабкі» я хачу расказаць пра новае жыццё, якое пачалося для мяне з пераходам граніцы. Гэта будзе мая першая радасная кніга. Запраектавала таксама сцэнарый для дзяцей. Яго змест я ўжо выразна ўяўляю сабе. Гэта — перамена ў жыцці народа заходніх абласцей.

Вярнуўшыся да работы ў школе, я нядаўна напісала вялікую брашуру для настаўнікаў. Яна склалася з маіх старых і новых назіранняў. На працягу 20 год польская школа імкнулася дэкласіраваць і асіміляваць не толькі дзяцей, але і настаўнікаў. З усёй рашучасцю ўскрываю я «метады» буржуазнай школы, паказваючы, што толькі совецкая школа выхоўвае сапраўды перадавых, усебакова развітых людзей.

Давід МІЦМАХЕР

„Сям'я“

Па заданню рэдакцыі «Октябр» я пішу рад белетрыстычных нарысаў пра беластоцкіх стаханаўцаў. Я прыходжу да людзей дадому, знаёмлюся з іх жыццём, з працай.

Адначасова працую над вялікім творам пра сваё маленства—«Сям'я». Напісаў новае апавяданне «Так гэта было».

Збіраюся пачаць работу па рэстаўрацыі свайго рамана «Вугальныя шахты». Цяпер шмат часу аддаю азнаямленню з яўрэйскай совецкай прозай, з новымі творамі совецкіх пісьменнікаў.

Юрый РАВІЧ

Новыя вершы

За апошнія восем месяцаў я напісаў каля 20 вершаў. Частка з іх звязана з новай для мяне тэматыкай—совецкай рэчаіснасцю, частка звернута да мінулага—да этапа барацьбы супроць капіталізма ў Польшчы.

Напісаў таксама некалькі апавяданняў і навел. Тэма большасці з іх—імперыялістычная вайна, вызваленне Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Думаю аб аповесці пра вайну, але гэта — у будучым.

Хацеў-бы пасля невялікай апрацоўкі перавыдаць выданую ў Варшаве ў 1933 годзе з цэнзурнымі скажэннямі аповесць «Тут спаць не дазваляецца». Тэма аповесці—безнадзейнае становішча моладзі ў былой панскай Польшчы, школа і ўніверсітэт, барацьба рэвалюцыйнай моладзі супроць рэакцыйнай улады.

ВЕРШЫ АБ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Тры дні і тры ночы ішоў полк. А навакол быў усё лес ды лес. Стаміліся людзі. Змучыліся коні. Ужо не ладзілася ў батальёнаў іх баявая чырвонаармейская песня. І вось здалёку паказалася вёска. Крычалі гусі, брахалі сабакі. Дзяўчаты ля рэчкі палошчуць бялізну. І стомленасці як не было. Тут-жа зрабілі прывал. Спявалі песні і паясалі на мосціку, што цераз рэчку. А сам аўтар ляжаў недалёка на беразе і пісаў, палажыўшы паперу на вінтоўку. У гэтую хвіліну пісалася лёгка, лёгка...

Мы расказалі змест аднаго з вершаў яўрэйскага савецкага паэта Л. Талалая, які ўвайшоў у яго новую кнігу — «У паходзе». Цыкл чырвонаармейскіх вершаў займае цэнтральнае месца ў гэтым зборніку. Усё што характэрна для прыведзенага намі верша—лірычнасць і ўменне звязваць свае інтымнейшыя пачуцці з жыццём і бытам Чырвонай Арміі — усё гэта можна знайсці ў большасці чырвонаармейскіх вершаў Талалая.

Талалай амаль заўсёды канкрэтны. Ён не імкнецца ўздзейнічаць на чытача рознымі рытарычнымі «выпадамі», агульнымі фразамі, бравурнымі рытмамі. Кожны верш Талалая ў новым зборніку — гэта малюнак з жыцця Чырвонай Арміі. Яны так і называюцца — «У дазоры», «На прывале» і г. д. І ад таго, што ў гэтых вершах так многа цеплыні і падкупляючай шчырасці, ад таго, што паэт паказаў у іх так многа назіральнасці і ўменне расказваць невялікімі, але трапнымі дэталямі—ад гэтага яго вершы ўспрымаюцца з амаль фізічнай яснасцю. І доўга яшчэ пасля прачытання гэтых вершаў чытачу здаецца, нібыта сам ён толькі што жыў чырвонаармейскім жыццём, разам з байцамі хадзіў у паход, разам з імі адпачываў на прывале.

Л. Талалай амаль ніколі не піша аб жыцці ў Чырвонай Арміі адарвана ад ўсяго, што робіцца ў нашай краіне. Чырвонаармейскія матывы пераплятаюцца ў яго часта з матывамі калгаснага жыцця, дзе па начах таксама змяняюцца дазоры ля калгасных гумнаў і свірнаў, дзе жывуць родныя, таварышы, падругі... І ад таго, што ў гэтых вершах пераплятаюцца вобразы і матывы двух жыццёскладаў — армейскага і «штацкага», калгаснага — ад гэтага песні Талалая робяцца неяк больш чалавечнымі, больш хвалюючымі... Талалай уцікае пры гэтым небяспекі аднастайнасці — ён не паўтараецца, знаходзіць кожны раз зусім новыя матывы і дэталі.

Там, дзе паэт адступае ад усяго гэтага, стаўшага ўжо традыцыяй у яго творчасці — у песнях адчуваецца схематычнасць, неканкрэтнасць, верш становіцца неперапанаўчым, сухім. У Талалая ёсць такія вершы, можна іх назваць. Гэта—«Чырвоная прысяга», «Ноч у караўле». Праўда, іх не так ужо многа, але іх зусім не павінна было-б быць у зборніку.

У кніжцы ёсць яшчэ рад лірычных вершаў. Аб іх трэба сказаць асобна.

У гэтых вершах Талалай адносіцца з вялікай пашанай да дзіцячых пачуццяў. Ён размаўляе з дзецьмі спакойным і роўным голасам, не націскаючы ні на якія інтанацыі.

Асабліва прыгожым атрымаўся верш «Маці». У вершы расказваецца аб адной маці, якая пайшла з дому і назаўсёды пакінула сваю маленькую дачку. Ад усяго верша вее такой свежасцю, так лёгка і прыгожа ўзнікаюць і змяняюцца адзін за адным маляўнічыя пейзажы, якімі паэт хоча супакоіць дзяўчынку, так многа болю і крыўды ў радках аб матулі, зусім нядобрай, зусім не пачцівай,—што без гэтага верша, на які паэт не звяртаў, можа, асаблівай увагі, яго кніга шмат страціла-б.

Зборнік «У паходзе» паказвае значны паэтычны рост Л. Талалая.

Н. ЛЕВІН.

Абмеркаванне новых твораў

Аб нашай паэзіі і аб новых вершах Пятруся Броўкі

* * *

Пятро ГЛЕБКА

У друку і ў прыватных размовах нашы крытыкі не аднойчы скардзіліся, што яны «вельмі засумавалі па добрых вершах». Глыбока засмучоныя, яны сталі сарамліва апускаць вочы і маўкліва абмінаць кожны нованадрукаваны верш, не стараючыся нават разабрацца — дрэнны ён ці добры. Так прайшлі незаўважанымі нашай крытыкай новыя кнігі вершаў Янкі Купалы, Якуба Коласа і цэлай плеяды маладых аўтараў. Тым часам паэты працавалі далей і, без усякай тэарэтычнай і практычнай у гэтым дапамогі крытыкаў, шукалі новых шляхоў развіцця паэзіі, аж пакуль і не падрыхтавалі яе далейшага ўздыму, «аб якім зараз можна гаварыць як аб рэальным, адбыўшымся факце».

Гаворачы аб новай кнізе вершаў Пятруся Броўкі, я мог-бы і не распачынаць гэтай адвечнай спрэчкі паміж паэтамі і крытыкамі, калі-б тав. Бярозкін у сваім артыкуле «Аб вершах» («Літаратура і мастацтва», № 8, 11 сакавіка 1940 г.) не закрануў і вершаў Пятруся Броўкі, стараючыся накіраваць паэта да «інтанацыйнага верша». Не згаджаючыся з гэтым, я вымушан закрануць і некаторыя іншыя палажэнні з артыкула тав. Бярозкіна.

Па-першае, што тычыцца агульных разважанняў тав. Бярозкіна аб зрухах у нашай паэзіі. Разважаючы аб гэтым, тав. Бярозкін лічыць, што гэтыя зрухі ад абстрактна-лазунговай паэзіі да сапраўднай, поўнакроўнай паэзіі адбыліся ў выніку пераключэння на новы матэрыял і аднаўлення парушанага адзінства паміж сэнсам верша і яго канкрэтна-пачуццёвай прыродай. Але такое сцвярджэнне вельмі аднабаковае, паколькі яно высвятляе толькі вынікі зруху, а не яго прычыны.

Мне здаецца, што прычыны новых павеваў у паэзіі крыюцца значна глыбей, чым гэта здаецца на першы погляд. Каб разабрацца ў гэтым, трэба прыгадаць даўно вядомую ісціну, што галоўным аб'ектам усякага мастацтва, у тым ліку і паэзіі, з'яўляецца чалавек. Пэўна гэта маючы на ўвазе, Іосіф Вісарыёнавіч Сталін і назваў пісьменнікаў інжынерамі чалавечых душ. Між тым, нашы паэты часта забываліся на гэтую непарушную ісціну мастацтва. Велізарныя падзеі сучаснасці, тварцамі якіх былі нашы савецкія людзі, засланялі часта ад нашых паэтаў гэтых жа людзей. Прыглядзіце так званую абстрактна-лазунговую паэзію: у ёй гаворыцца аб падзеях і фактах, аб машынах і рэчах, але не аб жывых людзях, не аб іх пачуццях і душах.

Выходзячы з гэтых меркаванняў мне здаецца, што недахопы нашай паэзіі былі (ды яшчэ і цяпер ёсць!) **не столькі ў малой дэталізацыі фактаў, аб якіх пісалі паэты, колькі ў занядбанні пачуццямі і страсцямі жывога сучаснага чалавека.** Прыгадайце класічную паэзію, і вы знойдзеце там не адзін выдатны верш, напісаны ў некалькі агульнай, абстрагіраванай форме. Нават выключнай сілы лірычны верш Пушкіна «К А. П. Керн» перасыпаны такімі эпітэтамі і параўнаннямі («чудное мгновенье», «гений чистой красоты», «томленья грусти безнадежной», «тревоги шумной суеты», «бурь порыв мятежный», які «рассеял прежние мечты» і інш.), якія не толькі з пункту гледжання нашай, але і тагачаснай паэтыкі нельга назваць канкрэтнымі дэталямі. Магчыма, што некаторыя нашы крытыкі з іх патрабаваннямі сугуба-рэальнай дэталі, ці, як яны гавораць, «блізкага абыдзённага прадмета», а гэта значыць бытавой, рэчавай дэталі, — магчыма, што такія крытыкі і гэты верш залічылі-б да вершаў абстрактных, але ад гэтага ён ніколькі-б не страціў у сваёй сіле, таму што ў ім б'ецца жывое чалавечае сэрца.

Драматычная літаратура, у якой, паводле выразу Бялінскага, пануе чалавек, не можа ўжо ў сілу асаблівасцей свайго жанра так непрыкметна для вока падмяніць чалавека і яго страсці бяздушнымі падзеямі ці фактамі. І поспехі нашай савецкай беларускай драматургіі (у прыватнасці, п'ес Крапівы) у значнай меры тлумачацца тым, што ў цэнтры яе ўвагі ўвесь час быў жывы сучасны чалавек.

Толькі гэтым, увагаю паэтаў да чалавека, да яго пачуццяў, тлумачыцца і тое ажыўленне, тыя радасныя зрухі, якія наглядаюцца ў апошні час у нашай паэзіі. Гэта, вядома, не значыць, што ў кожным невялікім, нават вельмі добрым лірычным вершы паэты даюць нам шырокія карціны чалавечага жыцця, ярка выпісаныя характары і г. д. Гэта немагчыма, ды гэтага і непатрэбна. «Мімалётнае і імгненнае адчуванне, якое ўзрушыла душу паэта, як вецер струны эолавай арфы, складае змест лірычнага твору», гаворыць Бялінскі. І мы ведаем у Пушкіна, у Фета, у Блока (асабліва ў апошняга) нямала вершаў, якія выражаюць надзвычай вокаімгненныя ўражанні, але якія насычаны глыбокімі настроямі і, нібы знутры, асветлены вялікім агнём пачуцця. І па гэтых настроях і пачуццях мы пазнаём чалавека, яго думы і душу, яго жыццё ў імкненні.

Такім чынам тэмай для верша можа быць і пейзаж, і каханне, і смерць, і геразм. Важна, каб паэт, на якую-б тэму ён ні пісаў, здолеў выразіць свае пачуцці так, каб у іх, як у кроплі вады, адлюстравалася жывая душа нашага сучаснага чалавека.

Вядома, гэтыя элементарныя ісціны Пятрусь Броўка зразумеў і адчуў як паэт не цяпер. Заставалася перамагчы пэўныя літаратурныя традыцыі. На гэта было патрачана некалькі год, за якія было напісана дзве кнігі. Пасля з'явілася новая кніга вершаў, аб якой будзе гутарка і якая носіць назву «Шляхамі баравымі».

І вось пасля ўсяго гэтага дзіўна гучыць другое сцвярджэнне тав. Бярозкіна ў тым-жа самым артыкуле, што быццамбы «у творчасці П. Броўкі апошніх год таксама намячаўся пэўны адыход ад патрабаванняў верша ў бок агульна-апісальных меркаванняў».

Бярэм кнігі Броўкі, пачынаючы ад зборніка «Пахавыя будні», пераглядаем іх і бачым, што якраз наадварот: з кожнай кнігай Броўка ўсё больш і больш адыходзіў ад факта і падзеі, набліжаючыся да чалавека і яго перажыванняў. І адна з кніг Пятруся Броўкі, выдадзеная яшчэ ў 1935 г., не дарам носіць назву «Прыход героя».

Тав. Бярозкін аргументуе, ці, праўдзівей, называе ў якасці аргумента свайго палажэння аб адыходзе Пятруся Броўкі «ў бок агульна-апісальных меркаванняў» паэму «Кацярына». Але нават прыняўшы пад увагу ўсе сапраўдныя і прыпісаныя гэтай паэме недахопы, нельга ніяк згадзіцца з тым, што гэта «адыход у бок агульна-апісальных меркаванняў», адыход ад паказу канкрэтнага жыцця да абстракцыі, адыход ад паказу чалавека. Наадварот, разумеючы, што цэнтрам паэзіі з'яўляецца чалавек, прывяло Пятруся Броўку да напісання паэмы «Кацярына». Тут паэт Броўка сустрэўся з новым чалавекам як з аб'ектам эпічнага твора, каб, праверыўшы на ім праўдзівасць сваіх пачуццяў і думак, перанесці яго як суб'екта ў лірычныя свае вершы. Ад гэтага пачалася і кніга «Шляхамі баравымі».

Я думаю, ніхто не стане спрачацца, што ў такіх вершах з новай кнігі Пятруся Броўкі, як «Думы аб правадыру», «Скрыпач», «Падарунак», «Сустрэча», «Танкісты», «З паходаў», «Апошні хлеб», «Дзед і ўнук»—безумоўна цэнтральнае месца займае чалавек. Яго радасць і смутак, яго весялосць і турботы, яго жаданні і мары складаюць змест гэтых вершаў.

Іначай абстаіць справа з такімі вершамі, як «Дождж», «Крыніца», «Паляванне», «Мяцеліца», «Мы з табой хадзілі часта ў поле», «Гэты кветкамі-пухам абсыпаны сад» і іншымі інтымна-лірычнымі пейзажнымі вершамі, дзе на першы погляд вобліка чалавека нібы і не відаць. Але гэта толькі на першы погляд. Прачытаўшы іх, мы прыпамінаем і цалкам згаджаемся з думкаю Бялінскага, што хаця «чыста лірычны твор з'яўляе сабою як-бы карціну... у ім галоўнае не сама карціна, а пачуццё, якое яна абуджае ў нас»...

Такім чынам і пейзажныя і інтымна-лірычныя новыя вершы Броўкі не ёсць вершы мёртвай з'явы, сухога факта, яны вершы чалавечага пачуцця, паэзія чалавечага сэрца. У гэтым іх сіла і ў гэтым іх асаблівасць і навізна як у творчасці самога Броўкі, так і наогул у нашай паэзіі.

Другая асаблівасць амаль усіх новых вершаў Пятруся Броўкі заключаецца ў тым, што паводле ледзь прыкметнага руху пачуцця, выражанага ў іх, мы пачынаем адчуваць рух душы чалавека нашага часу. Не толькі грамадская тэма, але і адвечная тэма кахання і пейзаж у творчасці Броўкі набываюць сваё адменнае асвятленне. Ён гаворыць часамі аб тым, што ўжо не нова, аб чым не раз, можа, было сказана, але гаворыць па-новаму, з пункту гледжання нашага сучасніка.

І гэты настрой праходзіць праз усе тэмы і праз усе жанры новай кнігі Пятруся Броўкі. А дыяпазон жанра і паэтычнага голаса паэта ў гэтай кнізе надзвычай вялікі: ён прасціраецца ад паэмы да песні, ад высокай патэтыкі да самай пяшчотнай лірыкі.

«Думы аб правадыру» напісаны паэтычна, шырокім размахам кісці.

> З людскіх глыбінь
> Прышоў ён, чалавек,
> І стаў над цэлым акіянам-светам.

І хаця тут няма так званай «канкрэтызацыі» праз дэталь, праз «блізкі абыдзённы прадмет», перад намі паўстае веліч і яснасць блізкага нам чалавека, веліч і нязмернасць людскога свету-акіяна. Пятрусь Броўка, не ў ганьбу кажучы некаторым нашым крытыкам, разумее, што у тым стылі, у якім напісаны «Думы аб правадыру», усякая бытавая «канкрэтызацыя» і «дэталізацыя» была-б не да месца. Больш таго, беручы нават канкрэтныя, але занадта вузкія дэталі, ён імкнецца некалькі абстрагіраваць іх, пашырыць:

> І гаманілі скрозь —
> Рака з ракою,
> Лясы, бары з прасторамі палёў,
> І птушкі
> З гнёзд, разбураных вайною,
> Ляцелі зноў да родных берагоў.

У даным выпадку адцягнены выраз «да родных берагоў» з'явіўся ў выніку таго, што паэт адчуў, як далейшая дэталізацыя можа прывесці да стылевых супярэчнасцей паміж першымі і апошнімі радкамі гэтай страфы. Тонкае адчуванне глыбока патэтычнага дазволіла паэту вытрымаць усе тры раздзелы гэтага верша ў адным высокім стылі і нарысаваць карціну шырыні нашых прастораў, і жыцця, і глыбіні замілавання, і любасці да таварыша Сталіна. У гэтым вершы наш сучаснік, гаспадар і грамадзянін Савецкай Беларусі, гаворыць аб сваёй гордасці і шчасці самым поўным голасам:

> У гомане бароў,
> У шолаху трысця
> Аб ім напеў чароўны мне пачуўся...
> З вачэй яго
> Я смагу напіў жыцця —
> Яны святлей крыніц на Беларусі.

Па-іншаму гэтыя настроі выказаны ў вершы «Падарунак». Там амаль не ўпамінаецца імя таварыша Сталіна, але ўсе думы, усе пачуцці, уся чалавечая любасць звернуты да яго. Паэт перадае іх праз вобразы навакольных людзей і карціну іхняга жыцця. Праўдзівае пачуццё падказала яму праўдзівасць людскіх палзін. Як народная загадка па сваёй слоўнай прастаце, гучыць у гэтым вершы рэпліка дзеда:

> Цяпер вы задуму
> Маю заўважайце —
> Тут восем раздзелаў,
> Нас восем у хаце.

Вось у гэтай прастаце і мілай непасрэднасці чалавечага пачуцця, у вялікай сіле любві я таксама пазнаю благародныя рухі душы нашага сучасніка. Яны асабліва ярка выступаюць у параўнанні з мінулым ці на фоне яго. Возьмем для гэтага верш «Скрыпач». Параўнаем скрыпача Андрэя з нашымі знаёмымі калгаснікамі з верша «Падарунак». Ён выпісан у Броўкі вельмі ярка, і сам па сабе слаўны чалавек:

> Акружку абыйдзі людзей,
> Пачуеш ты спярша:
> — Андрэй?!
> Ды гэта-ж чарадзей,
> Вясёлая душа.

Але не зважаючы на яго вясёлую душу, за Андрэем ходзіць нейкі нябачны цень тугі. Вакол яго адчуваецца настрой адзіноты:

> Садок у колькі вішань, сліў.
> Пад вокнамі касач.
> Хацінка ціхая.
> Там жыў
> Стары Андрэй-скрыпач.

Гэта мінулая адзінота вясёлай чалавечай душы прывяла Андрэя да таго, што ён стаў нейкі загадкавы: ён абходзіў нават куст, каб не сагнаць птушкі, якая пяе. І хоць аўтар пра гэта не гаворыць, але чытаеш паміж радкоў, што гэты дужы чалавек, сілач, вясёлая душа, быў адзінокі ва ўсім свеце і напэўна баяўся кожнага чалавека ў жыцці, баяўся самога жыцця.

А вось перад намі выступаюць нашы сучаснікі, людзі, якія не ведаюць, што такое адзінота, людзі вялікай упэўненасці і сілы. І адразу мяняюцца ў Броўкі не толькі фарбы верша, але і сама інтанацыя:

> А мы,
> Што многа год таму
> Стаялі пад акном —
> З-пад гэбля зладзілі яму
> Як след сасновы дом.

Нават смутак у гэтых людзей свой, адменны: у ім няма ні кроплі роспачы, а ёсць нейкая вялікая затоеная сіла, якая родзіцца ад непарушнай веры ў жыццё, ад усведамлення таго, што чалавек цвёрда стаіць на зямлі, што ён гаспадар жыцця і што свет належыць яму:

> І перадалі смутак наш
> Прасторам жоўтых ніў —
> Зайгралі мы Андрэеў марш,
> Што нам аддадзен быў.

Так выглядаюць нашы сучаснікі ў штодзённым, мірным жыцці—простыя і непасрэдныя ў сваіх пачуццях, у сваёй любві да правадыра і краіны, упэўненыя ў сваім сучасным і наступным, поўныя фізічных і душэўных сіл. Але вось яны ў якасці танкістаў трапляюць на фронт. Радзіма і партыя дала ім заданне:

> Прарвацца ў тыл,
> У сем назад —
> Такі атрыманы загад.

У гэтых абставінах якасці савецкага чалавека памнажаюцца на храбрасць і геразм. Але танкісты трапілі ў засаду. І вось

> У вочы пырснула агнём...
> Сказаць старэйшы змог:
> — Ну, што-ж, таварышы, памром?..
> —Памром!.. сказалі ўтрох.

Паэт пакуль што рысуе толькі карціну, і мы яшчэ не адчуваем той інтанацыі, з якой было сказана гэта страшнае слова: памром—з засмучэннем? з адчаем? з надзеяй? Належную інтанацыю паказвае толькі канцоўка:

> Ляцеў удалечы вякоў
> Магутны гімн большэвікоў.

Ва ўсіх гэтых і іншых надзвычай удалых кампазіцыйных завяршэннях многіх вершаў выявілася не толькі майстэрства Броўкі як паэта: тут выявілася ў першую чаргу і закончанасць паэтычнай думкі, як вынік непасрэднага і глыбокага адлюстравання настрояў і пачуццяў сучасната чалавека. Нажаль, я не маю ніякай магчымасці спыняцца ў паасобку на кожным вершы, каб даводзіць гэта. Лічу яшчэ неабходным закрануць толькі некалькі інтымна-лірычных і, асабліва, пейзажных вершаў, дзе на першы погляд, як я ўжо казаў, чалавечы вобліх цяжка і заўважыць.

Мы ўсе і досыць часта любім паўтараць, што савецкаму чалавеку нішто жывое і чалавечае не чужое. Між тым у творчасці мы аб гэтым забываемся. Броўка ўспомніў і напісаў некалькі прыродаапісальных і бытавых вершаў, прычым, здолеў на гэтую старую тэму сказаць панавому, здолеў асвятліць яе вялікім пачуццём новага чалавека. Вазьміце верш «Бор»—гэта амаль сімвал. (Заўважу ў дужках для аматараў сімвалізма, што гэта нічога агульнага з апошнім не мае). Рэальная, ярка выпісаная карціна старадаўняга бору, які непакорна змагаецца з няшчаднай бурай і дружнай сям'ёй абараняе сябе і хаціны сяліб... Як яна нагадвае чытачу карціну чалавечага змагання, змагання нашай краіны з капіталістычным светам! І колькі сілы і пачуцця веры ў дружную сям'ю абуджае гэты верш!

Тое-ж самае і верш «Дождж». Да гэтага верша, мне здаецца, больш як да якога іншага, можна дапасаваць словы Бялінскага аб тым, што часта ў лірычных вершы не так важна карціна, колькі тое пачуццё, якое яна выклікае. А гэтае пачуццё надзвычай ярка выражана ў вершы ў двух апошніх строфах. Тут і багацце сіл, і жаданне бітвы, і смага жыцця, і нарэшце, цвёрдая вера ў наступнае:

> Цераз вясёлкі бачыць зрок
> Зялёную траву.

Гэты-ж комплекс пачуццяў выклікае і верш «Мяцеліца». Праўда, тут напружанне пачуцця дасягае яшчэ большай сілы. Яно тут ускладняецца і трывогаю за каханага чалавека, і смуткам аб ім, надзеяй на скорае спатканне і музыкаю самога верша, якая не зможа зачараваць хіба ўжо зусім роўнадушнага да паэзіі і да хараства чалавека.

Нарэшце, возьмем вершы «Мы з табой хадзілі часта ў поле» і «Гэты кветкамі-пухам абсыпаны сад», у першым з якіх так многа празрыстасці ў вобразах і душэўнай чыстаты ў пачуццях, а ў другім—маладосці і вясны, неўціхамірнага жадання вечна кудысьці імкнуцца і вялікіх, часамі нават нязбытачных надзей:

> Будзем мёд сабіраць мы з пахучых
> далін...
> Сядзем потым спачыць мы на
> лістам адным
> Згодна ты?..
> Ты маўчыш...
> Паляцім?!
> Палядім.

Вядома, ёсць і ў гэтых вершах і ў іншых няўдалыя мясціны, а ў кнізе ёсць нават цэлыя няўдалыя вершы. Я не гавару ўжо пра такі сухі верш, як «Паэт», але нават і такі верш, як «Рыбак», зроблены па ўсёй форме «канкрэтнай дэталі», не выклікае ніякага пачуцця.

Аднак не гэтыя вершы і не дробныя недахопы вызначаюць характар новай кнігі Пятруся Броўкі. Яго вызначаюць вершы, у якіх цэнтральнае месца займае чалавек, яго пачуцці і думы, дарма што гэтыя вершы напісаны часамі аб дажджы ці аб крыніцы. У гэтых вершах Пятрусь Броўка зрабіў надзвычай удалую спробу перадаць жывыя пульсы чалавечага пачуцця так, што пад імі адчуваецца магутнае сэрца людзей нашага часу. А праўдзівасць і непасрэднасць пачуцця вызначыў ў сваю чаргу і разнастайны характар рытмічнага рысунка і страфікі. Гэта кніга ў гэтым сэнсе самая багатая не толькі ў творчасці самога Броўкі, а і ўсіх нашых малалых паэтаў. І, мне здаецца, што няма ніякага сэнсу цягнуць Броўку да інтанацыйнага верша на той толькі аснове, што ён, як гаворыць тав. Бярозкін, быццам-бы «паэт-прамоўца, паэт строга вызначанай інтанацыйнай устаноўкі».

Броўка стаіць на правільным шляху. Ён не толькі пашырыў круг сваёй тэматыкі, ён змяніў свой падыход да тэмы. Хочацца, каб роўналежна ішло і далейшае паглыбленне тэмы.

Калі гэта будзе, то не можа быць ніякага сумнення, што чарговая кніжка Пятруся Броўкі будзе новым поспехам у нашай паэзіі.

М. Смолкін

РАМАН „ПАЎСТАННЕ“ М. ПАСЛЯДОВІЧА

1.

Раман «Паўстанне» яшчэ не закончан. Аўтарам напісана толькі першая кніга. Гэта стварае пэўную цяжкасць у ацэнцы рамана, бо падзеі і характары, якія толькі намечаны ў першай кнізе, могуць быць больш дасканала разгорнуты ў далейшым.

Але-ж і тое, што ўжо надрукавана, дае магчымасць весці прынцыповую размову, тым больш, што тэма, распрацаваная ў рамане, з'яўляецца сапраўды эпічнай і значнай для ўсёй нашай літаратуры.

Гэты артыкул, аднак, не прэтэндуе на ўсебаковы разгляд слоўна-вобразнай сістэмы рамана (к гэтаму трэба будзе яшчэ вярнуцца), мы закранем толькі самае асноўнае, — тое, што на наш погляд вызначае пазнавальнае значэнне рамана і яго месца сярод твораў беларускай літаратуры на тую-ж тэму.

2.

Гераічная барацьба супроць белапольскіх драпежнікаў-акупантаў — адзін з самых драматычных эпізодаў у жыцці вялікага беларускага народа.

Гэта тэма дала беларускай літаратуры такія, атрымаўшыя высокую ацэнку чытачоў і грамадскасці, творы, як «Дрыгва» Якуба Коласа і «Партызаны» К. Крапівы.

Чытачы ад душы палюбілі творы Коласа і Крапівы таму, што тут яны ўбачылі глыбокае, праўдзівае мастацтва, адлюстраванне псіхалогіі змагаючагася за свабоду народа ў асобе яго тыповых прадстаўнікоў. Сіла мастацкага таленту Я. Коласа найбольш поўна выражана ў вобразе народнага героя—партызана Талаша. Дзед Талаш напісан войстра, смела, ярка, без усялякай аглядкі на традыцыйныя вобразы з партызанскіх аповесцей.

Галерэя вобразаў партызан, створаных у рускай савецкай літаратуры В. Івановым, А. Фадзеевым, А. Серафімовічам была-б далёка не поўнай без героя беларускіх лясоў, адважнага партызана Талаша. Гэтым тлумачыцца велізарны поспех аповесці «Дрыгва» — твора асновапаложнага для беларускай літаратуры, аднаго з найбольш значных твораў савецкай прозы.

«Дрыгва» — твор вялікага пазнавальнага значэння. Колькі мы-б не чыталі гістарычную літаратуру, як-бы дакладна мы не вывучалі факты, нашы веды гісторыі грамадзянскай вайны на Беларусі будуць не поўнымі, не яркімі без аповесці Я. Коласа. Больш таго, не пазнаёміўшыся з вобразам дзеда Талаша, мы не зразумеем псіхалогіі беларускага селяніна, для якога барацьба з белапалякамі была барацьбой за права жыць свабодна пад родным небам.

Раман М. Паслядовіча «Паўстанне» задуман як вялікае гістарычнае палатно, якое адлюстроўвае перыяд белапольскай акупацыі на Беларусі. Нават пры самым уважлівым чытанні рамана мы нідзе не знойдзем фактычнага разыходжання з гісторыяй. Больш таго, адчуваецца даўленне фактalогіі на аўтарскую фантазію.

І ўсё-ж у справе ўскрыцця гістарычнай законамернасці раман «Паўстанне» дае менш, чым аповесць «Дрыгва».

Імкнучыся захаваць пэўную гістарычную перспектыву, М. Паслядовіч часта не лічыцца з тым, што агульнае ў мастацкім творы можа быць выражана толькі праз глыбокае адлюстраванне канкрэтнага і праяўляе пэўную бесклапотнасць да абрысоўкі характараў і паводзін асноўных герояў свайго рамана.

3.

Не выпадкова пісьменнік М. Паслядовіч выбірае для мастацкага выражэння сваёй эпічнай тэмы форму вялікага гістарычнага рамана, стварэнне якога, не гледзячы на першыя зробленыя ўжо крокі, застаецца праблемнай задачай нашай літаратуры. Цяжка, вядома, правесці дакладную грань у навуковым вызначэнні рамана і аповесці.

Аднак няма сумнення ў тым, што раман адчыняе для пісьменніка большыя апавядальныя магчымасці, паколькі ў рамкі рамана ўкладваюцца вялікія эпізоды жыцця, часам цэлае жыццё, у якім, як у вялікім палатне, кожны чытач знойдзе што-небудзь блізкае і знаёмае яму.

Але раман стварае і пэўныя спецыфічныя цяжкасці, галоўная з якіх заключаецца ў расстаноўцы ўсіх дзеючых асоб па меры развіцця сюжэта. Гэтыя цяжкасці не змог перамагчы і М. Паслядовіч.

Пісьменнік не здолеў даць выразнай, канкрэтна-неабходнай характарыстыкі кожнаму персанажу рамана, не здолеў пазбавіць сюжэтную аснову рамана ад непатрэбных, другарадных дэталей, ускладняючых і затрудняючых апавяданне.

Так, напрыклад, у канцы першай часткі рамана, у момант, здавалася-б, самага важнага, самага значнага эпізода — паўстання сялян вёскі Верасніца, эпізода, дзеля якога, уласна кажучы, і разгортваюцца ўсе папярэднія падзеі, аўтар пачынае апавядаць аб сямейных адносінах фельчара Карася і яго «кісачкі», сяміпудовай сажыцельніцы Мар'і, напэўна думаючы, што гэта вельмі юмарыстычна і будзе цікава для чытача (а, мабыць, для паўнаты рэалістычнай карціны?).

Чытачу хочацца ведаць вынік боя паўстанцаў з белапалякамі, лёс смяротна-раненага юнака-партызана Мішкі Страмка, але па волі аўтара ён вымушан чытаць пра «баталію» паміж фельчарам і Мар'яй. У выніку гэтай фарсавай сцэны рэзка аслабляецца драматычная напружанасць і ўражанне ад моманту паўстання.

«Мёртвай душой» у рамане з'яўляецца і генерал Шэптыцкі, кіраўнік польскіх акупацыйных сіл, непасрэдны начальнік палкоўніка Свяніцкага. Аб ім мы толькі і ведаем, што ён мае прозвішча Шэптыцкі.

Чырвонаармеец Давід Верабей з'яўляецца ў рамане толькі для таго, каб праз некалькі старонак памерці.

4.

Неабходна аддаць належнае М. Паслядовічу. Ён добра ведае падзеі, аб якіх расказвае ў рамане. Адчуваецца крапатлівае вывучэнне гістарычных матэрыялаў перыяда грамадзянскай вайны на Беларусі. Уся ўвага, усе намаганні пісьменніка зведзены да таго, каб ні на іоту не адхіліцца ад гістарычнай праўдападобнасці.

Сюжэтаўтвараючымі момантамі рамана служаць сапраўдныя гістарычныя з'явы. Гістарычная праўда падкрэсліваецца ўвесь час: пачатак рамана, указанне на рад сапраўдных імён (партызан-матрос Андрэй Блажко і другія).

Вельмі блізкі да фактычных арыгіналаў подлыя служкі імперыялістычнай Антанты і польскіх паноў, члены так званай БНР — Гамулька, браты Цыркевічы.

Амаль даслоўна прыведзен у тэксце рамана гандлярскі ліст членаў Рады да кайзера Вільгельма («Беларусь — гэта лес, лён, мёд...»). Такім чынам аб знешняй гістарычнасці рамана не можа быць і спрэчак. Пачаткам рамана, яго завязкай з'яўляецца памятная дата 10 жніўня 1919 года, калі белапольскія банды, заняўшы Мінск, пачынаюць прасоўванне да р. Бярэзіны, распаляючы свае апетыты фантастычнымі марамі аб хуткім захопе Смаленска, а там, з дапамогаю «маткібоскай чэнстахоўскай» і... Масквы, а пакуль на сваім шляху руйнуючы сёлы, забіваючы людзей.

У рамане «Паўстанне» мы не знаходзім глыбокага мастацкага ўвасаблення гісторыі. Раман М. Паслядовіча не паглыбляе нашы веды гістарычнага, у тым сэнсе як гэта робіць твор Я. Коласа, ён больш ілюстрыруе агульнавядомае палажэнне аб барацьбе сялян супроць акупантаў фактамі з жыцця адной вёскі.

Галоўны недахоп гэтай ілюстратыўнасці хаваецца ў неглыбокай, няснелай распрацоўцы чалавечых характараў. у боязці адступіцца ад традыцыйнага ўяўлення аб тым або іншым вобразе. Асабліва гэта адносіцца да вобразаў станоўчых герояў, кіраўнікоў большэвіцкага падполля: Дзяміда, Рафаіла, Гайдукевіча, Андрэя Блажко, у значнай меры старшыні рэўкома Токарава і партызана Майсея Жаркевіча.

Яны, нажаль, засталіся фігурамі досыць схематычнымі. Для таго, каб паказаць іх сілу, М. Паслядовіч прыбягае да вонкавых прыёмаў характарыстыкі, г. зн., што пісьменнік ідзе па шляху, які больш «пратоптаны і лёгкі»:

> «Дзяміл, агромністы, з шырокімі, акругленымі плячамі і здаравеннымі ручышчамі, стаяў насупроць лямпы, пасярэдзіне пакою».

Такой-жа выпадковай і вонкавай з'яўляецца характарыстыка другіх членаў падпольнага большэвіцкага камітэта.

Так, пры знаёмстве з тэлеграфістам-камуністам Гайдукевічам, чалавекам, як запэўнівае нас аўтар, ва ўсіх адносінах станоўчым, чамусьці падкрэсліваецца яго заікатасць: «ён не мог звязна і лагічна (?) выказваць свае думкі, таму партыйны камітэт вызваліў яго заўсёды ад агітацыйнай работы». Больш нічога аб Гайдукевічу мы не даведваемся.

Столькі-ж мала скажа нам вобраз большэвіка Рафаіла («ён уляцеў у пакой, як бомба»).

Партрэт рэвалюцыянера-матроса Андрэя Блажко напісан так, як любілі маляваць «братішак»:

> «З правай кішэні бушлата вытыркалася рукаяць «нагана» з пацёртай насечкай. Віктар яшчэ заўважыў след кулямётных істужак цераз плечы. І непакорны пільны позірк блакітных вачэй».

Без наступнага паглыблення дзеяннем гэта фігура робіцца трафарэтнай. Там, дзе Паслядовіч адмаўляецца ад «гладкапісу», ад спрошчана-партрэтнай характарыстыкі, мы знаходзім сапраўды жывых людзей і яны паказваюць на тое, што М. Паслядовіч — пісьменнік здольны і, калі мы гаворым аб значных недахопах рамана, звязаных з ілюстратыўнасцю, то гэтыя недахопы абумоўлены ў першую чаргу недакладным уяўленнем пісьменніка аб сутнасці катэгорыі рэалістычнага.

Аўтарскай удачай трэба прызнаць вобразы маладых партызанаў: Віктара Жаркевіча і, асабліва, Мішкі Страмка. Гэтыя вобразы паданы ў дынаміцы.

Паміж першымі эпізодамі рамана, у якіх юнак Віктар па ўласнай ініцыятыве ідзе ноччу да войта Корбута і папярэджвае аб кары смерцю, якая пасцігне яго, калі ён уздумае выдаць каго-небудзь з партызан, і яркай сцэнай урачыстай клятвы Віктара: «Я скажу так, таварышы: усё сваё жыццё, да астатняга дыхання аддам за справу Леніна» — праходзіць нямнога часу. Але мы верым гарачай клятве Віктара, мы ўпэўнены, што ён так і зробіць, бо некалькі тыдняў польскай акупацыі павярнулі ўсё жыццё Віктара.

Да Корбута, на хутар, ішоў рамантычна настроены юнак, які начытаўся кніг аб гераічных учынках. У лес, да партызан, Віктара цягне не рамантыка лясоў, а арганічная патрэбнасць вызваліць родную вёску ад здзекаў белапольскай банды.

Асабліва жыва і праўдзіва ў псіхалагічных адносінах паданы другі хлапец, партызан Мішка Страмок. Гэта гарачы, нястрымны характар. Яму не цярпіцца, ён хоча як мага хутчэй уступіць у партызанскі атрад. І калі, нарэшце, Віктар прыводзіць яго да партызанскай прысягі, «мінулася юнацкая бесклапотнасць Мішкі, двоістыя пачуцці ахопліваюць яго. То ён бачыў сябе ў самай сярэдзіне крывавай бойкі. Ад яго моцных удараў паны падаюць на зямлю, а некаторыя баязліва ўцякаюць у кусты. То яму прадстаўлялася жудасная сцэна, як уначы жандары абкружаюць двор, хапаюць Мішку і бязлітасна катуюць... Паветра, здавалася Мішку, аж грымела перасцярогай».

Мішка і Віктар — найбольш актыўныя, энергічныя людзі рамана. Нездарма паўстанне ў вёсцы Верасніца пачынаюць яны.

Пакуль што яны не сталі яшчэ цэнтральнымі героямі рамана, але, бясспрэчна будучае рамана заключаецца ў гэтых вобразах, — пры ўмове, калі аўтар смела, без аглядкі на трафарэт, будзе працягваць адлюстраванне іх жыццёвага шляху. А аўтар рамана гэта можа зрабіць.

Е. Садоўскі

ЛЁТЧЫК

Бакушэў лётае вельмі даўно — яшчэ з часоў імперыялістычнай вайны. Адкуль у яго, паштовага тэлеграфіста, з'явілася страсць да лётніцтва — і не скажаш. Наземны чалавек, старанны тэлеграфіст—мог па 20 гадзін не адыходзіць ад апарата — і раптам, на здзіўленне ўсіх, ідзе простым рабочым у маскоўскія авіяцыйныя майстэрні, дзень і ноч возіцца каля матораў.

Лётчык Седой адразу-ж распазнаў смеласць і прыроджаную цягу да лётнага жыцця ў гэтага скромнага хлопца ў сіняй спецоўцы. Седой першы раз падняў Бакушэва над Масквой.

— Ну, што, дружа, страшна?

— Ні кропелькі.

— А калі я цябе пакалыхаю крыху? — і Седой, які адчуваў сябе ў паветры, як рыба ў вадзе, прымусіў папляса́ць свой самалёт. У Бакушэва ў першае імгненне захлынула сэрца, а пасля страх знік, як туман у сонечны дзень.

З гэтага дня былы тэлеграфіст ужо не мог не лятаць. Як птушка, не задумваючыся, адрываецца ад зямлі ў паветра, так і ён прывычна і ўпэўнена ішоў на ўзлёт. Больш чым поўгода Седой браў яго з сабою ў палёты...

... Румынскі фронт імперыялістычнай вайны. Першы чырвоны авіяцыйны атрад ў рэвалюцыйным Петраградзе. «Паветраны паштальён» пры Смольным. Адзін штурмавік ў 52-й стралковай дывізіі, калі яна пад кіраўніцтвам Фрунзе брала Перакоп. Там-жа — гэта праклятая рана, якая не дае спакою ў непагодныя дні.

***

Палёт над Чорным морам. Белыя, пагрузіўшыся на судны, уцякалі пасля паражэння пад Перакопам. Бакушэў усхваляваны прыбег у саклю, дзе знаходзіўся начальнік штаба і выпаліў:

— Дазвольце дагнаць і скінуць на развітанне пару падаруначкаў?

— Як дагнаць? — Яны-ж ужо ў моры.

— Дык я таму і прашуся, я іх дагоню.

— Бакушэў, Пётр Ігнацьевіч, ды вы ў сваім розуме? На чым-жа вы паляціце? А калі вымушаная пасадка? Вы што на дно мора сядзеце?

— Не будзе пасадкі, таварыш начальнік штаба. Ручаюся. Дазвольце. Вельмі прашу.

Начальнік штаба пацісну́ў плячыма.

— Калі ўпэўнены, дык не пярэчу, гэта ва ўсякім выпадку цікавая тактычная ідэя.

Бакушэў нават не даслухаў. Куляй сарваўся з месца і праз колькі часу ўжо ляцеў у першы палёт над морам. Груз бомбаў абцяжарваў самалёт і хуткасць яго не перавышала ста кілометраў. Унізе прасціралася незвычайная карціна — бурлізае, поўлае пены мора. Вецер наганяў хвалі і яны, ускіпаючы, імкнуліся апярэдзіць адна адну. Зверху бязмежныя водныя прасторы здаваліся цёмнабурымі, і Бакушэў зразумеў, чаму гэту водную аграмадзіну назвалі чорнай. Лётчыка, калі ён лётае над зямлёй, заўсёды заспакайвае думка: штоб там ні здарылася — зямля блізка. Гэта звычайнае чалавечае пачуццё апоры. Бакушэў ляцеў над морам не на гідрасамалёце, а на калёснай машыне, ляцеў першы раз. На моры не сядзеш — верная пагібель, а ён ляцеў, ляцеў і насвістваў: «Шумпае мора, сіні Байкал»... А вось і доўгачакаŭныя клубы параходнага дыму. За гарызонтам паказаліся сілуэты трох параходаў.

К абеду, як-бы нічога і не было, ён вярнуўся на аэрадром і начальнік штаба з захапленнем расказваў пра Бакушэва.

— Які малайчына, а! Ціхі, скромны, а подзвіг які! Не, вы падумайце, на форменнай «труне» адважыцца ляцець над морам і яшчэ так паспяхова!

Бакушэва акружылі камандзіры і пачалі наперабой распытвацца аб падрабязнасцях палёта. Ён ледзь паспяваў адказваць.

— Ды што вы прычапіліся? Ці было страшна? А хто там думаў пра страх? На параходах, калі ўбачылі мой самалёт з чырвонымі зоркамі на крыллях, узнялася паніка. Дзесяткі куль завішчалі навакол. Я набраў вышыню, зрабіў тры кругі і ўвесь свой бомбавы запас скінуў на галовы белых генералаў. Вось і ўсё.

Марскі палёт праславіў Бакушэва. У савецкіх газетах Крыма з'явіліся яго партрэты і першыя заметкі аб ім.

«Труна», на якой лётаў Бакушэў, даўно ў музеі. Цяпер самому Бакушэву, калі ён глядзіць на «труну», дзіўна — няўжо гэта «карэта» магло лунаць у паветры?

Лётаючы нядаўна над Балтыйскім морам на велізарным светлакрылым гідрасамалёце, Пётр Ігнацьевіч мімаволі ўспомніў свой першы марскі палёт. Цяпер ён лётаў уначы. Уначы над морам. Лётаць усляпую — гэта самае дасканалае майстэрства для лётчыка.

Гідрасамалёт Бакушэва — цудоўная, з вялікай любоўю ўдасканаленая светлакрылая птушка. Ён узняўся на самалёце, калі ўжо сцямнела, атрымаўшы заданне адшукаць і разбамбіць варожыя караблі, што нядаўна зняліся з рэйда ў невядомым напрамку.

У кабінцы яркая электрычная лямпачка. Утульна. Не верыцца, што за вокнамі са слюды беспрасветная цемра — ні зорак, ні месяца. Гэта лепш. Карта вызначае курс, компас пацвярджае правільнасць узятага напрамку, а гадзіннік паказвае, колькі кілометраў пакрыў самалёт. Бакушэў ляціць трэцюю гадзіну. Выглянуў з кабінкі. Мёртвая начная цемра. Раптам па небу, апісваючы імгненны круг, праімчаўся бледнажоўты прамень пражэктара. Бакушэў узяў вышыню.

— Свецяць з караблёў, пачулі матор, — падумаў ён і, падняўшыся на 4 тысячы метраў, знік у воблаках. Пражэктарныя праменні мільгнулі злева. «Трэба змяніць напрамак». Але праменні больш не паяўляліся і навакол зноў панавала густая цемра.

— Не ўцякуць! Дастану! — сціскаючы зубы, сказаў сам сабе, мяняючы баявы курс.

Справа чотка застракатаў матор. Бакушэў прывык распазнаваць сістэму самалёта па шуму матора.

— Знішчальнік!

Капітан пагасіў бартавыя агні і праверыў гашэткі кулямёта. Прайшло дзесяць напружаных мінут, знішчальнік знік таксама раптоўна, як і з'явіўся.

Недзе ўнізе раскідана рухаліся рэдкія аганькі.

— Караблі!

Бакушэў павялічыў хуткасць, знізіўся, скінуў светавую бомбу і, калі яна, ўзарваўшыся, асвяціла прасторы, пачаў трапна скідваць цяжкія бомбы.

Прайшло не больш шасці мінут. Упэўнены ў трапным пападанні сваіх бомбаў, Бакушэў зноў набраў вышыню і знік у начным небе.

Ужо развіднела, калі машына плаўна села на віту паблізу сваёй базы.

Ныла нага, але Бакушэў не адчуваў болю.

МАЛАДЫЯ ПАЭТЫ НА ЭКСКУРСІІ Ў МАСКВЕ

Праўленнем Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР былі камандыраваны на экскурсію ў Маскву ўдзельнікі курсаў-канферэнцыі маладых пісьменнікаў М. Засім, А. Іверс, Ю. Равіч, Е. Зомерфельд і Дзянісенка.

Курсанты прабылі ў Маскве пяць дзён. Большасць з іх, паэты заходніх абласцей БССР, былі ў Маскве ўпершыню.

Курсанты наведалі ў Маскве маўзалей Леніна, музей імя Леніна, музей імя Пушкіна, сельскагаспадарчую выстаўку, Трэцьякоўскую галерэю, канал Волга-Масква, метро, Цэнтральны парк культуры і адпачынку імя М. Горкага, цырк «Шапіто» і планетарый.

ПА СЛЯДАХ ЭЛІЗЫ ОЖЭШКА

Невялічкі, чысты горад Гродна—цяпер раённы цэнтр Беластоцкай вобласці. Тут на працягу 40 год—тры чвэрці свайго жыцця—жыла і працавала вядомая польская пісьменніца Эліза Ожэшка.

Прыезджы пойдзе ад вакзала па шырокай, гладка выбрукаванай, абсаджанай ліпамі і каштанамі вуліцы імя Ожэшка. На аднапавярховым драўляным доме № 17, які прытуліўся ў цяню векавых дрэў, прыцягне яго ўвагу мемарыяльная дошка на польскай мове:

«У гэтым доме жыла і памерла Эліза Ожэшка 1842—1910».

Але дарэмна прыезджы будзе шукаць ля ўваходных дзвярэй надпісу: Музей Ожэшка.

Надпісу такога няма і музея няма. Польскія правіцелі так і не паклапаціліся аб тым, каб домік, у якім жыла вядомая польская пісьменніца, стаў музеем. Не гледзячы на існаванне ў Гродне таварыства імя Элізы Ожэшка, былі дапушчаны бестурботныя, калі не вандальскія, адносіны да прадметаў, звязаных з жыццём і творчасцю пісьменніцы. Шмат якія прадметы былі раскрадзены ці згублены. Збіраннем іх, захоўваннем, ужо не гаворачы аб апрацоўцы, не цікавіліся. Былі, расказваюць, аб гэтым размовы, ды так на размовах справа і кончылася.

Прыязджаеш у Гродну, пытаешся ў старажылаў, гутарыш з інтэлігентамі, якія лічаць сябе хавальнікамі запаветаў Элізы Ожэшка: дзе знайсці сляды жыццёвага шляху пісьменніцы, нямых сведкаў яе жыцця?

Гэта ведаюць нямногія. І ведаюць нямногае.

У старым замку польскіх каралёў, на высокім беразе Нёмана, сабраны цудам уцалелыя рэчы Элізы Ожэшка. Іх, нажаль, невялікая колькасць, і для даследчыка ўяўляюць яны небагаты матэрыял, але звычайнага наведвальніка здольны расчуліць гэтыя старасвецкія прадметы, акружаўшыя адну з перадавых жанчын свайго часу і свайго асяроддзя.

Ужо ў першым сваім творы—«Карцінка з галодных гадоў» (1866) пісьменніца настойліва супроцьстаўляе два светы: свет багатых і свет бедных.

Некаторыя з ідэй вялікай пісьменніцы-гуманісткі толькі ў эпоху перамогшага сацыялізма змаглі знайсці поўнае ажыццяўленне.

Не будучы дыялектыкам, Эліза Ожэшка не ўсвядоміла законаў грамадскага развіцця. Таму яна не мела амаль у сваім слоўніку слова «барацьба»—мела слова «пакуты». У маленькім альбоме ў чырвоным аксамітным пераплёце знаходзім мы выпіскі пісьменніцы з прачытаных кніг. На адной з першых старонак запісана цытата:

«У сто разоў лепш цярпець з прыгнечанымі, чым радавацца з прыгнятальнікамі».

А пакут на зямлі было досыць. Дзесяткі твораў Элізы Ожэшка сваім сюжэтам, мовай, тыпамі, назвамі мясцовасцей сведчаць аб тым, якімі глыбокімі карэннямі творчасць яе зраслася з мясцовай глебай. Аб гэтым гавораць і экспанаты, якія захаваліся ў Гродненскім гістарычным музеі.

Праўда, як сказана ўжо, не даюць яны поўнай карціны жыцця і дзейнасці пісьменніцы ва ўсіх яе этапах, але тым не менш даюць уяўленне аб густах, схільнасцях і некаторых рысах яе характара.

Тут экспаніраваны сямейныя фотаздымкі, візітныя білеты, рукадзелле на народныя матывы, уласнаручна зроблены кніжны пераплёт, нарэшце, гербарыі, складзеныя пісьменніцай з траў і кветак. Гэта сапраўдныя творы мастацтва: так памастацку, з такім тонкім густам падабраны лініі і колеры раслін. Арнаментацыяй з засушаных кветак багаты і згаданы вышэй альбом з цытатамі. З чыста літаратурных помнікаў захаваўся каштоўны рукапіс трохтомнай аповесці «Над Нёманам» (1886—87), карэспандэнцыя з выдаўцом і рэдактарам, два асобныя лісткі з запісамі пісьменніцы, выданне «Над Нёманам» 1899 года.

Гэтая невялікая колькасць прадметаў, якія захаваліся ад вандалізма нядаўнага мінулага і знайшлі прытулак у старажытных сценах гістарычнага музея ў Гродне, знаходзяцца цяпер пад клапатлівым наглядам дырэктара музея тав. В. А. Карэлінай. Пры дапамозе работнікаў музея т.т. М. Улейчык і В. Кальварыйскай матэрыял гэты ўжо інвентарызуецца, каб арганізаваць залу Элізы Ожэшка ў рамках гістарычнага музея.

С. ДРЭЭР.

БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ ПРЫ КІНОІНСТЫТУЦЕ

Пры Усесаюзным дзяржаўным інстытуце кінематаграфіі ў Маскве з восені гэтага года арганізуецца беларускае акторскае аддзяленне, якое будзе рыхтаваць акторскія кадры для беларускай кінематаграфіі.

Папярэдні адбор жадаючых паступіць на акторскае аддзяленне будзе праводзіцца пры кіностудыі «Савецкая Беларусь». Асобы, якія паспяхова вытрымаюць спецыяльныя іспыты пры студыі (сцэнічны эцюд, слых, голас, фізпадрыхтоўка) будуць накіраваны студыяй у Маскву для ўдзелу ў конкурсных іспытах па агульнаадукацыйных дысцыплінах і акторскаму майстэрству.

На беларускае аддзяленне акторскага факультэта прымаюцца грамадзяне, якія маюць сярэднюю асвету, ва ўзросце ад 17 да 25 год для жанчын і ад 17 да 35 год для мужчын.

Усяго будзе прынята ў гэтым годзе на 1-шы курс 25 чалавек.

Б.



Клуб імя Леніна Беларускай чыгункі арганізаваў джаз-аркестр, які абслугоўвае палявыя станцыі.

На здымку: джаз-аркестр на рэпетыцыі.

Фота **А. Шаевіча** (Фотахроніка БЕЛТА).

Міхась Калачынскі

НА ВЫБАРГСКАЙ ДАРОЗЕ

Урывак з паэмы

Героям Карэльскага перашэйка.
Аўтар.

Рака Сястра, а за ракой —
Прасекі, пушчы і сялібы.
Тут пачынаўся першы бой
І слаўны шлях на Выбарг.

— На Тэрыокі! — быў загад.
Яго мы споўнілі да слова.
І ўдзень і ўноч байцоў атрад
Ішоў праз дрот і лес сасновы.

І тэрыокская сцяна,
Дзе вораг вымасціў засаду,
Раскажа, як ішла вайна,
Як нашы падалі снарады;

Як танкі ўральскаю бранёй
Давілі ворага ў знямозе.
То быў вялікі слаўны бой
На выбаргскай дарозе.

***

Дыміцца родны аганёк,
Мы сушым мокрыя панчохі.
Каля дружка прылёг дружок,
Прыснуць наважыўся хоць трохі.

На ўсіх ватовыя штаны,
З аўчынак рунных рукавіцы:
Усе са слуцкай стараны,
З адных палёў, з адной зямліцы.

Гляджу навокал, пазнаю —
Сябры маленства, аднагодкі,
Народжаны ў пару маю —
Адзін абхват, адна паходка.

Не спіць мой стомлены дружок,
Платон Булатнікаў, сяльчанін.
Не спіш, дык раскажы, браток,
Аб тым, што ў памяці паўстане.

Платон з кішэні дастае
Хусцінку слуцкага ўзору,
Нашыўкі хустачкі тае
Пра дружбу палкую гавораць.

Дзяўчыну любую здалёк
Платон шкадуе, ўспамінае,
І памяць — з поля васілёк
Яго з Галінаю еднае.

Хадзілі летам па лугу,
Што лёг у нас ад прыгумення.
Зрывалі кветкі на бягу,
Каменчыкі збіралі ў жмені.

Што робіш ты ў час такі,
Галіна, добрая случанка:
Мо' вышываеш васількі,
Мо' думы цепліш пра каханка?

Ён з намі, любы хлопец твой,
Гатовы выйсці па трывозе
У наступленне, ў новы бой
На выбаргскай дарозе.

На выбаргскай дарозе мы
За мір ваюем твой, айчына.
У час раз'юшанай зімы
Ты з намі, любая дзяўчына.

Настане дзень і грымне бой.
А зараз ноч слыве заціштам,
А мы на снезе. Мы з табой
У партыю заявы пішам.

Калі прыдзецца паміраць,
Памром удвох як комуністы.
І мы закончылі пісаць
Лісткі пры вогнішчы іскрыстым.

Пагрэлі рукі ў аганьку
І напісалі ваенкому
Па невялікаму лістку,
Яшчэ па поўлістка — дадому.

Халоднай позняю парой
Удвох заснулі над паперай,
А заінеўшай раніцой
Пайшлі, імклівыя, наперад.

Далёка мёрзлая Сястра,
Далёка горад Тэрыокі.
І за Бабошынам вярста
Адлічана армейскім крокам.

Далей стаяць кругом драты,
Пераплятаюцца радамі,
Пакручаны хвайняк густы,
На камені навален камень.

Яліны воўчыя і рвы
На танкі скрозь падрыхтаваны,
Лясы, паляны, паплавы
Адзеты ў сталь, замураваны.

Лясная купіна, грудок
Употай дзеючымі сталі,
Густое дрэўка і кусток
Нам небяспеку захавалі.

Мы падышлі да іх сцяной,
Да ліній ворага ў жалезе.
Схаваўся вораг пад зямлёй,
Наверх у сполаху не лезе.

З хадоў патайных, чорных нор,
Чырвоным войскам пагражае.
Глыбокі снег, гушчарны бор
Сабой нас толькі засланяюць.

Мы сталі блізка — к фронту фронт,
Здаецца, дзве сышліся хмары.
Ішоў суровы новы год,
Адходзіў год са славай стары.

Паўзводна бралі мы ламы,
Рыдлёўкі, печы-жалезкі;
Паўзводна выкапалі мы
Сабе глыбокія зямлянкі.

Сталетніх хвой у тры рады
Заместа столі навалілі,
Не страшны сталі халады,
Вясёла трубы задымілі.

Пасля суровых дзён турбот
Паўкругам стомленыя селі,
Маскву здалёк пад новы год
Мы слухалі на наваселлі.

Яна, далёкая, ў красе
Святочным гоманам гамоніць,
І голас блізкі к нам нясе
У край заснежаны Суомі.

Мы ўспамінаем Крэмль тады,
Стаіць ён мірны, задумённы,
У свята мудры правадыр
Ідзе па плошчы, па чырвонай;

Прывычна нам яго хада,
Знаёма ўсмешка дарагая,
У самых страшных халадах
Яна нас сонцам саграбае.

І мы са Сталіным жывём,
І думы ў нас аб перамозе,
І мы са Сталіным ідзём
Па выбаргскай дарозе.

Зіма 1940 г.
С. Мялола.

А. Далін

У пошуках стылю

За апошнія гады нашы мастакі шмат спрачаюцца аб рэалізме і натуралізме ў мастацтве. Спрэчкі гэтыя не выпадковыя. Яны выкліканы перш за ўсё імкненнем савецкіх мастакоў да вялікага мастацтва, дастойнага нашай сацыялістычнай эпохі.

Было-б няправільным агульна ганіць натуралізм, як гэта робяць цяпер многія. Нельга забываць, што ў пэўны час натуралізм выступаў і як з'ява прагрэсіўная. Творчасць Слюцэра, напрыклад, у значнай меры натуралістычна — прыгадаем хоць бы яго «Калодзезь»,—але-ж бясспрэчна, што яна ў вялікай меры спрыяла развіццю рэалістычнага мастацтва Рэнесанса.

Натуралізм, як метад пасіўнага сузірання, напрыклад, у эпоху заняпаду капіталістычнай культуры, у сілу сваёй нязменнай сувязі з жывой прыродай, у пэўнай ступені служыў базай для ўзнікнення новага—рэалістычнага мастацтва.

І для рэаліста, і для натураліста жывая прырода і чалавечая дзейнасць з'яўляюцца прадметам мастацтва. У гэтым у іх агульнае. Розніца, значыць, у самых адносінах рэаліста і натураліста да прыроды. Натураліст бачыць толькі праўду натуры, перадае толькі вонкавую сутнасць з'яў, тады як рэаліст імкнецца перш за ўсё паказаць праўду мастацтва—раскрыць змест натуры і свае адносіны да гэтай натуры. Калі мы захапляемся «Протадыяканам» І. Рэпіна, «Папай Інакенціем» Веласкеза, «Партрэтам Марозава» В. Серова, дык гэта перш за ўсё таму, што гэтыя мастакі дапамаглі нам убачыць у гэтых вобразах такія глыбіні чалавечага характара, якіх мы не заўважылі-б звычайным вокам, калі-б нават наглядалі протадыякана, папу і фабрыканта ў самым жыцці.

Значыць, рэалізм з'яўляецца мастацтвам абагульнення, адбора з многіх дэталей таго галоўнага, характэрнага і тыповага, што і акрэслівае вобраз у мастацтве. Гаворачы аб небяспецы натуралізма ў савецкім мастацтве, трэба разумець пад гэтым не столькі самую небяспеку, колькі недастатковае ўменне некаторых нашых мастакоў пранікаць у сутнасць паказваемай з'явы, недастатковы ўзровень іх прафесіянальнага майстэрства. Можна, напрыклад, абвінавачваць у натуралізме такіх мастакоў, як маскоўскі жывапісец В. Якаўлеў ці беларускі скульптар А. Азгур, паколькі абодва гэтыя мастакі валодаюць высокім прафесіянальным майстэрствам, але, не валодаючы дастаткова моцнай творчай індывідуальнасцю, скатваюцца ў радзе сваіх работ да натуралізма. Прыгадаем хоць бы «Купанне чырвонафлотцаў» і «Старацелі» В. Якаўлева, партрэты Я. Купалы і Я. Коласа—работы З. Азгура. Але было-б наіўна абвінавачваць у натуралізме тых мастакоў, якія яшчэ не валодаюць дастатковай прафесіянальнай граматнасцю і якія ў сілу гэтага не толькі не могуць стварыць глыбока-рэалістычнага вобраза, але пакуль што не дасягнулі таго высокага прафесіянальнага майстэрства, якім, як правіла, валодалі натуралісты.

Стыль не ўзнікае адразу. Стыль сацыялістычнага рэалізма нараджаецца ў барацьбе прагрэсіўных пачаткаў новага з прадрассудкамі мінулага. У работах лепшых мастакоў нашай краіны — Б. Іогансона, С. Герасімава, В. Мухінай, С. Меркурава мы ўжо бачым рысы гэтага новага стылю. Для гэтых мастакоў, як і для многіх іншых вядучых майстраў, натуралізм не з'яўляецца небяспекай, паколькі іх метад нічога агульнага з натуралізмам не мае; задача гэтых мастакоў зводзіцца да яшчэ больш глыбокага пранікнення ў акружаючую рэчаіснасць, да ўдасканалення свайго ўмельства — яшчэ лепш бачыць, абагульняць, тварыць.

Як ужо гаварылася, з натуралізмам трэба змагацца там, дзе ён выступае як метад абыякавай рэгістрацыі паказваемай падзеі ці натуры. Асабліва ўважліва трэба прыглядацца да тых работ, дзе натуралізм выступае пад сцягам асваення класічнай спадчыны. Так, некаторыя мастакі, упадаючы ў «изощренную» дэталізацыю натуры, апраўдваюць свой натуралістычны метад спасыланнем на вялікага Рэмбрандта. Гэта, вядома, бяссэнсіца! Бясспрэчна, што Рэмбрандт быў вялікім майстрам дэталі. Але, спасылаючыся на Рэмбрандта, нельга забываць аб якасных уласцівасцях рэмбрандтаўскай дэталізацыі.

Яшчэ ў старажытныя часы было вядома, што жыццё чалавека, яго праца, радасці і пакуты застаюцца як-бы запячатлёнымі на твары і руках чалавека. Іменна таму Рэмбрандт амаль ва ўсіх сваіх партрэтах дае характарыстыку вобраза праз характарыстыку твару і рук, ставячы ўсё апошняе ў цень. Прыгадаем хоць-бы партрэты старога і старой у Эрмітажы. Рэмбрандт валодаў шчаслівым дарам «бачыць натуру», дэталь дапамагала яму выявіць тыповае і характэрнае, у натуралістаў-жа дэталізацыя натуры сама па сабе ўзводзіцца ў творчы прынцып.

Развіццю рэалістычнага мастацтва перашкаджае таксама і надзвычайная «апека» над мастакамі. У рэзультаце гэтага самую вучобу ў вялікіх майстраў некаторыя мастакі пачалі ўводзіць у нейкія загадзя зададзеныя тэхнічныя прынцыпы. Мастак Н. Крымаў, напрыклад, выказаў думку, што ў карціне важней за ўсё адшукаць тон, пры чым ён спасылаецца на «Вечарніцы» І. Рэпіна. Відавочна, выходзячы з гэтага-ж крытэрыя, мастак Е. Кацман «угледзеў» у серабрыста-перламутравым каларыце ледзь не характэрную ўласцівасць беларускага жывапісу. Каларыт і тон — гэта паняцце не раней зададзенае, а арганічна ўзнікаючае на палатне, неразрыўна ад самога зместу карціны.

У святле сказанага варта разгледзець, напрыклад, карціну Н. Пашкевіча «Беларускія партызаны ў таварыша Сталіна». Карціна задумана глыбока і смела: сустрэча правадыра з беларускімі чырвонымі партызанамі перарастае ў абагулежую эпапею барацьбы рэвалюцыйнага народа за сваю свабоду, — барацьбы, якой кіруе вялікая партыя бальшэвікоў. Да недахопаў карціны трэба аднесці яе каларыт. Жывапісны строй карціны некалькі неарганічны зместу, ён падпарадкаван як-бы загадзя зададзенаму серабрыстаму тону, скаваўшаму жывапісца і прымусіўшаму яго падганяць каларыт пад гэты тон, што і прывяло да прыкметнай «нейтралізацыі» каларыта і саміх герояў карціны.

У параўнанні з карцінай Н. Пашкевіча карціна Е. Зайцава «Уступленне Чырвонай Арміі ў Мінск» робіць уражанне менш закончанай. Але мастаку ўдалося перадаць у ёй рух вялікай масы людзей, суровую і рамантычную ўрачыстасць чырвонаармейцаў, уступаючых у горад, як у свой родны дом. Робячы ўражанне менш закончанай і ўступаючы ў рысунку, карціна Е. Зайцава ўсё-ж больш пераканаўчая па свайму жывапіснаму ладу, паколькі каларыт тут арганічны са зместам.

Н. Пашкевіч і Е. Зайцаў — выдатныя прадстаўнікі сучаснага беларускага жывапісу. Сіла гэтых мастакоў заключаецца ў тым, што яны, упарта навучаючыся ў вялікіх майстроў рускага мастацтва, у прыватнасці ў В. Сурыкава і І. Рэпіна, імкнуцца пры гэтым гаварыць сваім голасам.

Але што такое свой голас у мастацтве? Скульптар М. Керзін, напрыклад, выступаючы на творчай нарадзе, прысвечанай вынікам дэкады, абураўся «беспрынцыповасцю» некаторых крытыкаў, якім адначасна падабаюцца і работы А. Грубэ і З. Азгура. Як можна адначасна захапляцца высокаграматнымі работамі З. Азгура і работамі А. Грубэ, якія мяжуюць з такой «свабоднай» творчасці, якая наўрад ці мае што-небудзь агульнае з рэалізмам?

Нам думаецца, што М. Керзін не праў. Мастак павінен, вядома, прытрымлівацца пэўных прынцыпаў у мастацтве і змагацца за гэтыя прынцыпы, але гэта не значыць, што ён павінен патрабаваць і ад другіх няўхільнага следавання гэтым прынцыпам і з пагардай глядзець на работы, якія не адпавядаюць яго асабістаму густу.

М. Керзін праў, калі патрабуе ад мастака прафесіянальнага майстэрства, якога, магчыма, нехапае А. Грубэ, але ён не праў, калі ігнарыруе права А. Грубэ на свой голас у мастацтве.

Гавораць, што А. Грубэ парушае самыя асновы рэалізма, паколькі ён допускае дэфармацыю натуры, як-бы парушаючы тым самым даныя прыродай прапорцыі. Але-ж у нейкай меры дэфарміраваў натуру і Мікельанджэло, аднак наўрад ці хто скажа, што гэты тварэц бессмяротных вобразаў і свайго стылю не быў рэалістам. У нашыя дні В. Мухіна, стварыўшы дзівосны рамантычны вобраз М. Горкага, дапусціла надзвычайную выцягнутасць фігуры Горкага ў адносінах да шырыні плеч, аднак цэльнасць вобраза гэтым не парушана. Дэфармацыя ўспрымаецца тут, як мастацкі апраўданая. Нам скажуць, што гэта дэфармацыя прадыктавана і ў некаторай ступені апраўдана законамі скульптуры манументальнай, разлічанай на агляд у прасторы. Але-ж А. Грубэ таму і дэфарміруе натуру, што ён мастак манументальнага стылю.

Гавораць таксама, у прыватнасці М. Керзін, што работы А. Грубэ недастаткова пластычны. Але-ж недастаткова пластычны і работы З. Азгура. Відавочна, пластыка залежыць не толькі ад прафесіянальнай граматнасці, але і ад умення мастака будаваць вобраз, падпарадкуючы яму ўсю масу матэрыяла.

Той факт, што ў нашай рэспубліцы працуюць такія майстры розных творчых напрамкаў, як З. Азгур, А. Бразер, А. Грубэ, А. Бембель, Н. Рапапорт, гаворыць толькі аб творчай спеласці беларускага мастацтва.

Значыць, трэба не скоўваць мастацтва прапаведдзю адной якой-небудзь школы, а развіваць шматграннасць савецкага мастацтва. А вось шматграннасці формаў і жанраў беларускім скульптарам і, асабліва, жывапісцам яшчэ нехапае. Гэта тлумачыцца, у прыватнасці, і тым, што некаторыя нашы мастакі пішуць не тое, што ім бліжэй і больш зразумела. Пейзажысту Н. Дучыцу, напрыклад, параілі ўзяцца за тэматычную карціну. Ясна, што ў Н. Дучыца, пейзажыста па ўсяму свайму духоўнаму ладу і вывучцы, нічога добрага не магло атрымацца з карціны. А. Бразер імкнецца ствараць складаныя кампазіцыі, калі па сваёй прыродзе ён партрэтыст. Н. Тарасікаў узяўся за складаную гістарычную карціну ў той час, як ён мастак дэкарацыйнага стылю.

Мастаку неабходна ўсямерна развіваць сваю творчую індывідуальнасць, бо толькі пры гэтых умовах ён здолее зрабіцца ў сваёй творчасці выразіцелем перадавых ідэй сваёй эпохі.

Шэрае і нуднае вынікае ў мастацтве яшчэ і таму, што многія нашы мастакі забылі аб фактары харастза ў мастацтве. М. Керзін глыбока праў, калі напамінае аб гэтым маладым мастакам. Хараство не ёсць паняцце тэхнічнае, абумоўленае толькі прафесіянальным майстэрствам. Хараство ў мастацтве — гэта крытэрый самога светаадчування мастака.

Мастак сацыялістычнай эпохі, разняволіўшай чалавека ад матэрыяльнага і духоўнага прыгнёту, павінен — таксама як паэт — адгукацца на ўсё прыгожае, любіць гэта прыгожае, узбагачаць сябе не толькі разумовым, але і пачуццёвым успрыняццем свету і звяртаць гэта прыгожае свету ў выглядзе твораў мастацтва.

Артыкул друкуецца ў парадку абмеркавання.



Юны скрыпач піонер **Міша Зісман** — выдатнік 3 курса Магілеўскай музычнай школы.
Фота **К. Якубовіча** (Фотахроніка БЕЛТА).

У ПРАЎЛЕННІ ССПБ

10 жніўня адбылося чарговае пасяджэнне праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР. На пасяджэнні была абмеркавана пастанова прэзідыума ССП СССР па пытаннях беларускай літаратуры. Згодна гэтай пастановы на рускай мове павінна быць выдана анталогія беларускай паэзіі. У анталогію ўключаны народная паэзія, класічная паэзія і сучасная совецкая паэзія Беларусі. Прэзідыум ССП СССР рэкамендуе журналу «Литературный критик» пашырыць разгляд асобных твораў беларускай літаратуры, асвятляць агульныя пытанні станаўлення і развіцця яе. Штомесячным журналам і асабліва «Литературной газете» рэкамендавана змяшчаць рэцэнзіі на новыя кнігі непасрэдна па беларускаму арыгіналу, не чакаючы выхаду з друку перакладa на рускую мову.

Праўленне ССПБ вырашыла звярнуцца ў Дзяржлітвыдат з просьбай фарсіраваць выпуск анталогіі беларускай паэзіі на рускай мове. Адзначаючы недапушчальнасць затрымкі з выданнем рамана Эд. Самуйлёнка «Будучыня» на рускай мове, праўленне пастанавіла звярнуцца па гэтаму пытанню са спецыяльным пісьмом у «Литературную газету».

Праўленне ССПБ заслухала таксама справаздачу кіраўніка курсаў маладых пісьменнікаў тав. А. Стаховіча. На курсах займалася 24 чалавекі, сярод якіх—М. Засім, А. Іверс, Г. Новік, П. Прануза, Д. Кавалёў, Ю. Равіч, А. Чарнышэвіч і інш. План заняткаў выканан поўнасцю. З маладымі пісьменнікамі правялі гутаркі тт. К. Крапіва, М. Лынькоў, К. Чорны, М. Клімковіч, П. Глебка, Р. Мурашка. Яны расказалі, як працавалі і працуюць над новымі творамі, дзяліліся сваім творчым вопытам.

Праўленне ССП БССР прызнала работу курсаў здавальняючай і вырашыла практыкаваць і ў далейшым скліканне курсаў маладых пісьменнікаў.

На гэтым-жа пасяджэнні была заслухана заява рускага паэта А. Куперштока аб прыёме яго ў члены ССП. Дакладчык П. Глебка падрабязна расказаў прысутным пра творчасць маладога здольнага паэта і перакладчыка беларускай паэзіі. А. Куперштoк працуе ў паэзіі з 1935 года, ён напісаў некалькі дзесяткаў вершаў, якія друкаваліся ва ўсесаюзных і рэспубліканскіх журналах і газетах. Вершы А. Куперштока—арыгінальныя, лірычныя.

А. Купершток прачытаў некалькі сваіх новых вершаў.

Выступіўшыя ў спрэчках т.т. М. Ільінскі, П. Броўка, З. Целесін, Х. Мальцінскі, М. Лўшын, М. Клімковіч сышліся на адной думцы: А. Купершток здольны паэт, яго вершы маюць самастойную літаратурную вартасць. Пастановай праўлення тав. А. Купершток аднагалосна прыняты у члены Саюза совецкіх пісьменнікаў.

Помнікі мастацтва рукапіснай кнігі

Беларускі народ стварыў выдатныя багацці ва ўсіх галінах выяўленчага мастацтва. Беларуская разьба, кераміка, ткацтва па свайму высокаму мастацкаму майстэрству, багаццю і рознастайнасці арнаментаў вядомы з даўніх часоў далёка за межамі Беларусі.

Асобнай галінай мастацтва ў старой Беларусі з'яўлялася мастацтва кніжнай ці, больш дакладна, рукапіснай графікі, вытокі якой узыходзяць да XI—XII стагоддзяў.

Захаваўшыяся дагэтуль і вядомыя нам старажытныя ілюстрыраваныя беларускія рукапісы сведчаць аб тым, што гэты від мастацтва быў развіт і распаўсюджан усюды на Беларусі, дасягнуўшы вялікага росквіта ў XIV—XVII стагоддзях.

Большасць рукапісаў упрыгожвалася разрысаванымі загалоўнымі літарамі, застаўкамі, канцоўкамі, часам мініяцюрамі і іншымі аздобамі. Атрамант, якім пісаліся рукапісы, быў, як мяркуецца, металічнага састава. Для загалоўных літараў, заставак і канцовак ужывалі чырвоную фарбу—кінавар, якую прывозілі перш з Грэцыі, пазней з захаду. У тых-жа выпадках ужывалі золата,—у больш старажытных рукапісных помніках надзвычай рэдка, а з канца XIV стагоддзя, асабліва ў XV—XVII стагоддзях—часцей. Для заставак і разрысоўкі літараў ужывалі фарбы: жоўтую, блакітную і фіялетавую.

Неабходна ўказаць, што ў старэйшых беларускіх рукапісах рысункі сустракаюцца рэдка, арнамент аднастайны, застаўкі і разрысаваныя літары характарызуюцца геаметрычнай правільнасцю ліній і натуральнасцю паказу людзей, жывёлы і раслін. З XIII стагоддзя ў арнаменце рукапісаў паяўляюцца фантастычныя звяры, птушкі, драконы і г. д., з парушэннем натуральных формаў.

Арнамент беларускіх рукапісаў, пачынаючы з XV стагоддзя, характэрны паяўленнем пляценняў, галінак, кветак, раслін. Людзі-ж і жывёлы амаль адсутнічаюць.

Самыя старажытныя ілюстрыраваныя беларускія рукапісы паказваюць вялікую ўпэўненасць рукі пісца-ілюстратара, дасканаласць мастацкай каліграфічнай тэхнікі, незвычайнае ўмельства перапісчыкаў, якія з выдатным майстэрствам пісалі загалоўныя літары, разрысоўвалі кнігі застаўкамі і канцоўкамі, а часта ўпрыгожвалі рукапісы выдатнымі мініяцюрамі.

У сваім вершы «Перапісчык» вядомы беларускі паэт Максім Багдановіч так гаворыць аб працы беларускіх пісцоў-ілюстратараў рукапісаў:

> На чыстым аркушы, прад вузенькім вакнем
> Прыгожа літары выводзіць ён пяром,
> Устаўляючы паміж іх чорнымі радамі
> Чырвоную страку; усякімі цвятамі,
> Рознакалёрнымі галоўкамі звяроў
> І птах нявіданых, сплященнем завіткоў
> Ён пакрашае скрозь — даволі ёсць знароўкі—
> Свае шматфарбныя застаўкі і канцоўкі.
> І загалоўкі ўсе — няма куды спяшыць!..

Значную цікавасць для гісторыі развіцця мастацтва кніжнай графікі Беларусі яўляе сабою вядомы нам рукапіс беларускага паходжання—Тураўскае евангелле XI стагоддзя, знойдзенае ў 1865 годзе П. І. Сокалавым. Яно складаецца з 10-ці аркушаў ці 20 старонак, пісана уставам XI стагоддзя па 18 радкоў на старонцы. Пергамент евангелля шчыльны, глянцаваны, колер атраманту каштанавы, у загалоўках і ў пачатковых літарах евангелля ўжываецца кінавар з сіняй і цёмназялёнай фарбай, якая месцамі перайшла ў блакітную і зеленаватую.

Тураўскім евангелле названа па месцы адкрыцця—у м. Тураве (Палеская вобласць, БССР) і таму, што яшчэ ў пачатку XVI стагоддзя яно належала тураўскай прэабражэнскай царкве, аб чым сведчаць запісы на палях 4-й і 12-й старонак евангелля, зробленыя князем Канстанцінам Іванавічам Астрожскім. Запіс кн. Астрожскага на 4-й старонцы адносіцца да лютага месяца 1513 года.

Упрыгожванне загалоўкаў і пачатковых літараў Тураўскага евангелля характэрна для рускага графічнага мастацтва XI стагоддзя. Аб гэтым сведчыць водгук вучонага, акадэміка І. І. Срэзнеўскага, які дэтальна вывучыў Тураўскі рукапіс: «Што кніга была пісана ў XI стагоддзі, даказваецца і рысункам літараў і правапісам».

Яўляючы сабою значную гістарычную каштоўнасць, Тураўскае евангелле было скапіравана і выдана па арыгіналу ў 1869 годзе ў Вільне.

Да помнікаў беларускай мастацкай кніжнай графікі XIV стагоддзя належаць Аршанскае і Мсціжскае евангеллі. Першае ўпрыгожана двума застаўкамі і мае рысункі розных жывёл і птушак, напісаных кінаварам. Другое, якое налічвае 178 аркушаў, пісана уставам XIV стагоддзя на пергаменце, у два слупкі па 24 радкі ў слупку. Гэты рукапіс заслугоўвае асаблівай увагі як узор літарнага арнамента XIV стагоддзя. Дзівосныя і рознастайныя формы загалоўных літараў і заставак; на большасці з іх нарысаваны пачварныя звяры, дзівосныя птушкі, пераплеценыя хвасты гадзюк і г. д.

Мімаволі захапляешся, разглядаючы арнамент Тураўскага рукапісу, багатай і незвычайнальнай фантазіяй безыменнага пісца-мастака, які, не гледзячы на аднастайнасць літараў і частых іх паўтор, сам амаль не паўтараецца, вышукваючы для іх рознастайныя, іншы раз вельмі дзівосныя, формы.

Рэдка, рэдка калі ўдаецца высветліць імя пісцоў-ілюстратараў і мініяцюрыстаў, якія ўпрыгожвалі старыя беларускія рукапісы сваім незацейлівым мастацтвам.

У гэтых адносінах выключную цікавасць яўляюць сабою старажытныя армянскія рукапісы, якія маюць амаль заўсёды імя мастака і пісца, дату і месца напісання.

У старых беларускіх рукапісах гэтых вестак мы амаль не знаходзім, што вельмі ўскладняе работу па іх вывучэнню.

Да ілюстратараў беларускіх рукапісаў, чые імёны дайшлі да нас, трэба аднесці, у першую чаргу, паповіча Бярозку, перапісчыка «Чэцьі» у 1489 годзе.

У сваім запісу на рукапісу паповіч Бярозка гаворыць, што «Чэцья» гэта напісана ў гор. Каменцы (Гродненшчына), што ён, Бярозка, родам з Навагрудка. Цікава адзначыць, што мова «Чэцьі» беларуская і таму яна яўляе сабою адзін з цікавейшых старажытнейшых помнікаў беларускай пісьменнасці.

У рукапісным евангеллі з багата арнаментыраванымі золатам і кінаварам загалоўнымі літарамі і застаўкамі, пісаным у Слуцку ў 1582 годзе, ёсць запіс, што евангелле перапісана і ілюстрыравана рукою Юрыя Юр'евіча Олелько (ці Олелькавіча).

У XVI стагоддзі напісан і ўпрыгожан мастацкімі застаўкамі дзяком Ермалаем для жыравіцкай царквы трэбнік.

У 1631 годзе пісаў і ілюстрыраваў Супрасльскі памінальнік, або сінодык, Спефан Каханевіч.

Мастацкія застаўкі і загалоўныя літары ў рукапісным Віцебскім евангеллі 1743 года належаць Васілю Амельнянскаму.

Вядомы Волпінскі (Беластоцкая вобласць) малітвеннік «Махзор» упрыгожан дзівоснай арнаментыкай мініяцюрыста Хаіма Мееровіча (1781 год).

Іван Калінковіч з мястэчка Рубяжэвічы напісаў і ўпрыгожыў рысункамі і застаўкамі вельмі тонкай работы рукапіс, знойдзены ў сяле Цімкавічы былога Слуцкага павета.

Гэта далёка не поўны пералік мастакоў-мініяцюрыстаў і ілюстратараў беларускіх рукапісаў, імёны якіх удалося нам устанавіць.

Трэба падкрэсліць, што работа над вывучэннем мастацтва старых беларускіх рукапісаў з'яўляецца справай дагэтуль яшчэ зусім закінутай. Ніхто да апошняга часу не цікавіўся пытаннем збірання і вывучэння гэтых цікавейшых помнікаў старога беларускага мастацтва, якія маюць, бясспрэчна, выключную цікавасць не толькі з пункту гледжання гістарычнага, гісторыка-літаратурнага і лінгвістычнага, але і з боку мастацтвазнаўчага.

У гэтых адносінах нам трэба вучыцца ў Арменіі, якая здолела за кароткі час выявіць і сабраць у спецыяльна арганізаваным дзяржаўным сховішчы рукапісаў усе найбольш каштоўныя армянскія рукапісы, што ў значнай меры аблягчыла іх вывучэнне і далейшае захаванне.

Выстаўка беларускіх ілюстрыраваных рукапісаў XI—XVIII стагоддзяў у часе дэкады беларускага мастацтва ў Маскве ўпершыню паказала багацце мастацкай спадчыны беларускага народа, пазнаёміла з высокай мастацкай адаронасцю старых беларускіх мастакоў-графікаў.

Пытанне вывучэння гісторыі ўпрыгожвання кнігі ў Беларусі патрабуе безадкладнай увагі з боку нашых навуковых устаноў і інстытутаў. Неабходна выявіць і сабраць у адно ўсе беларускія рукапісы, раскіданыя ў сучасны момант як у самой Беларусі, так і за яе межамі з тым, каб дэтальна вывучыць іх, што з'явіцца каштоўным укладам у справу вывучэння мастацкай спадчыны багата адоранага беларускага народа.

С. ПАЛЕЕС,
старшы навуковы работнік Карціннай галерэі БССР.



Непазнавальна змянілася аблічча гарадоў заходніх абласцей Совецкай Беларусі.
На здымку: выгляд Совецкай плошчы гор. Беластока раней (злева) і цяпер.
Фота **Е. Халдзея** (Фотахроніка БЕЛТА).


ДЗЕЙСНА ДАПАМАГАЦЬ ДРАМГУРТКАМ

15 снежня пачынаецца першы тур Усесаюзнага агляду тэатральнай самадзейнасці. Часу для падрыхтоўкі засталося мала. Між тым, рэспубліканскі Дом народнай творчасці, дзе павінна быць сканцэнтрыравана ўся практычная работа па агляду, бяздзейнічае. Аб тым, што робіцца на месцах, як працуюць тэатральныя калектывы, што яны пакажуць на аглядзе, — работнікі Дома народнай творчасці не маюць нават уяўлення.

Адсутнасць кіраўніцтва з боку рэспубліканскага Дома народнай творчасці сказваецца галоўным чынам на арганізацыі шэфства майстроў мастацтваў над самадзейнасцю. У апошні час шэфская работа амаль зусім закінута. Між тым, шэфская дапамога вельмі неабходна, асабліва зараз, калі кіраўніцтва самадзейнымі гурткамі пераходзіць ад прафесіяналаў—платных работнікаў клубаў да актыва саміх гурткоў мастацкай самадзейнасці. Між іншым, гэта акалічнасць выклікала ў некаторых работнікаў Дома народнай творчасці недарэчны непакой аб тым, каб скарачэнне платных кіраўнікоў гурткамі не адбілася на самадзейнасці, хоць ёсць выдатныя прыклады работы дзесяткаў калектываў, якія ніколі не мелі платных кіраўнікоў, як драмкалектыў Віцебскага клуба чыгуначнікаў (кіраўнік — доктар Воінаў), драмкалектыў Дома соцкультуры ў Ашмянах (кіраўнік — настаўнік тав. Салярчык), драмгурток Дома соцкультуры ў Глыбокім (кіраўнік — работнік аптэкі тав. Адлер) і многія іншыя.

Задача Дома народнай творчасці — падтрымаць маладых кіраўнікоў тэатральных калектываў, наладзіць шырокую арганізацыйную, метадычную, кансультацыйную дапамогу тэатральным самадзейным калектывам, прыцягнуць да гэтай справы шэфаў—майстроў мастацтваў, якія ніколі не адмаўлялі і цяпер не адмовяць Дому народнай творчасці ў сваёй актыўнай дапамозе. Трэба толькі шэфскую работу ўмела арганізаваць і кіраваць ёю.

І. В.



Адкрыт пасля рэканструкцыі вакзал у Мінску.
На здымку: архітэктура касавай залы вакзала.
Фота **Б. Вернера** (Фотахроніка БЕЛТА).

Касцюмерная для самадзейных гурткоў

Самадзейныя тэатральныя калектывы даўно ўжо ставілі пытанне аб арганізацыі касцюмернай, якая забяспечвала-б іх патрэбным рэквізітам. Зараз такая касцюмерная арганізуецца пры клубе металістаў імя Варашылава. Яна будзе абслугоўваць самадзейныя тэатральныя калектывы Мінскай вобласці.

Касцюмернай будзе перадан увесь рэквізіт, які раней выдаваўся напракат самадзейным тэатральным калектывам Белдрамтэатрам. Апрача таго, аблвыканком асігнаваў 10 тысяч рублёў на набыццё новых гарнітураў і іншага рэквізіту.

Пры касцюмернай арганізуецца цырульня, у якой цырульнік-грымёр будзе выконваць заказы драмгурткоў на парыкі.

Касцюмерная пачне працаваць 1-га верасня.

ДА НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

У тэатральным вучылішчы

1940—1941 навучальны год—першы год, калі ў тэатральным вучылішчы БССР будуць працаваць усе чатыры курсы. Гэты год таксама вызначаецца тым, што вучылішча дасць першы выпуск актораў, першае папаўненне тэатрам БССР. Усё гэта ставіць перад кіраўніцтвам вучылішча новыя задачы, ускладае на яго значна больш адказнасці за поспех навучальнага года.

1939—40 навучальны год меў рад буйных недахопаў. Асноўным з іх быў вялікі адсеў студэнтаў—44 чал. за год. Так, напрыклад, 15 чалавек адсеялася па прафесіянальнай непрыгоднасці. Гэта гаворыць аб тым, што прыёмныя іспыты былі дрэнна пастаўлены і ў вучылішча трапіла значная група малападрыхтаваных і маладольных людзей. Чатыры чалавекі не вярнуліся на заняткі пасля летніх канікулаў, чатыры—выключаны з вучылішча, як прагульшчыкі. Апошняе сведчыць аб вельмі слабай вучэбнай дысцыпліне і недастатковай выхаваўчай рабоце сярод студэнтаў.

Значны адсеў прывёў да такога становішча, калі на трох апошніх курсах вучылішча налічваецца ўсяго 64 чалавекі, прычым з 3-га на 4-ты курс павінны перайсці толькі 16 чалавек.

З пераводнымі іспытамі ў мінулым навучальным годзе таксама было не ўсё добра. Узяць, напрыклад, тых-жа 16 чалавек, якія павінны быць пераведзены на 4-ты курс. Толькі 5 з іх здалі залікі. Астатнія пераведзены «умоўна» у сувязі з тым, што яны «не паспелі» здаць залікі.

Натуральна, што такія і падобныя ім непаладкі не могуць не адбіцца на якасці вучобы, на выкананні вучэбнай праграмы. Дырэктару вучылішча тав. Фрыду і ўсяму настаўніцкаму калектыву трэба ўлічыць недахопы мінулага навучальнага года і дабіцца чоткай, эфектыўнай работы.

На першы курс акторскага аддзялення ў гэтым годзе павінны быць прыняты 50 чалавек. Ёсць указанне Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР аб камплектаванні ў гэтым годзе вучылішча на базе дзесяцігодкі, гэта значыць аб прыёме толькі скончыўшых сярэднюю навучальную ўстанову. Між тым, з 108 заяў толькі восем падалы моладдзю з поўнай сярэдняй асветай. Астатнія прэтэндэнты на паступленне ў вучылішча маюць няпоўную сярэднюю асвету. Гэта ставіць пад пагрозу добраякаснае камплектаванне першага курса.

Лепш абстаіць справа на харэаграфічным аддзяленні. Тут таксама павінна быць прынята 50 чалавек, прычым курс будзе ўкамплектаваны, галоўным чынам, за лік 39 дзяцей падрыхтоўчай групы, з якіх 14 прымалі ўдзел у дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве. Паступіла таксама 47 заяў аб прыёме. Такім чынам, харэаграфічнае аддзяленне будзе ўкамплектавана поўнасцю.

Пашырэнне вучылішча на 100 вучняў ставіць пытанне аб павелічэнні вучэбнай плошчы. У будынку Тэатра оперы і балета, дзе змяшчаецца вучылішча, такая магчымасць ёсць. Упраўленне па справах мастацтваў павінна і ў гэтай справе дапамагчы вучылішчу.

У музычнай школе

Штогод мінская музычная школа вымушана значнай частцы дзяцей адмаўляць у прыёме ў сувязі з недахопам вучэбных аўдыторый. Некалькі класаў, якія ёсць у распараджэнні школы, эксплаатыруюцца 15 — 16 гадзін у суткі амаль без перапынкаў. На складанне графіка скарыстання класаў вучэбная частка школы траціць шмат часу, вызначаючы дзесяткі складанейшых камбінацый, але ўвязаць інтарэсы школы з элементарнымі ўмовамі працы педагогаў і вучняў амаль немагчыма.

Пытанне не адзін раз абмяркоўвалася ў розных арганізацыях, але і дагэтуль у будынку, які па сутнасці цесны і для адной музшколы, займаюцца дзве школы — музычная і 42-я агульнаадукацыйная.

Даўно гавораць аб стварэнні ў Мінску музычнай дзесяцігодкі. Прыняты былі рашэнні, але ажыццяўлення іх пакуль не відаць.

Музшкола атрымала звыш 400 заяў аб прыёме і збіраецца прыняць, прыкладам, 80 дзяцей.

Гэтымі днямі Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР рашыла — для захавання дзіцячага харавога калектыва, прымаўшага ўдзел у дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве і паказаўшага добрыя вынікі, — арганізаваць на базе гэтага дзіцячага калектыва гарадскі дзіцячы хор у 100 — 120 чалавек пры Мінскай музычнай школе. Кіраўніцтву школы прапанавана забяспечыць хор кваліфіцыраваным мастацкім кіраўніцтвам.

***

Да пачатку навучальнага года засталіся лічаныя дні. Упраўленне па справах мастацтваў павінна ў бліжэйшыя-ж два-тры дні знішчыць усе перашкоды, якія стаяць на шляху навучальных устаноў перад пачаткам заняткаў.

І. ПРАЎДЗІН.

Е. СІКАР

Выдатны паэт Азербайджана

Азербайджан заўсёды быў краінай паэтаў, народных песняроў-імправізатараў, вандруючых ашутаў, казачнікаў і апавядальнікаў, якія славяцца не толькі ў краінах Усхода, але і ў Еўропе. Але адвечнае прыгнечанне душыла творчыя народныя таленты, было крыніцай глыбокіх пакутванняў такіх выдатных паэтаў, як Фізулі, Нізамі, Вагіф, Закір. Зараз мы з'яўляемся сведкамі нараджэння рада новых творчых імён, новых літаратурных жанраў, новых значных твораў, якія сведчаць, што літаратура совецкага Азербайджана дасягнула вялікіх ідэйна-мастацкіх вышынь. Мы знаёмімся з новым пакаленнем нацыянальных пісьменнікаў, якія выраслі ў годы росквіта соцыялістычнай культуры свабоднага Азербайджана і зараз знаходзяцца ў перыядзе творчай спеласці. Гэта паэты Самед Вургун, Сулейман Рустам, Мамед Рагім, Расул Рза, Осман Сарывелі, Зейнал Халіл, гэта паэтэсы Нігяр і Дзільбазі. Гэта празаікі і драматургі Сабіт Рахман, Сулейман Рагімаў, Мір-Джалал, Алі Веліеў, Абдула Шайк, Мірза Ібрагімаў і інш.

Асабліва высокую ацэнку літаратурнай дзейнасці заслужыў выдатны азербайджанскі паэт Самед Вургун.

Самеда Вургуна ведаюць і высока цэняць як майстра совецкай паэзіі не толькі на радзіме яго—у Азербайджане, але далёка за яе межамі. Вершы Вургуна перакладзены на многія мовы совецкіх народаў, распаўсюджаны па ўсёй тэрыторыі Саюза.

Самед Вургун—таленавіцейшы прадстаўнік нацыянальнай паэзіі, любімец працоўных Азербайджана. Паэт-ордэнаносец, ён заслужыў вялікі гонар—яго выбралі ў Вярхоўны Совет Азербайджанскай рэспублікі. Вургун перакладчык на азербайджанскую мову «Еўгенія Онегіна» Пушкіна і «Віцязя ў тыгравай шкуры» Шота Руставелі. Ён—аўтар буйных драм «Вагіф» і «Ханлар». Вургун — паэт, які прайшоў пятнаццацігадовы творчы шлях. Нарадзіўся ён у 1906 годзе ў сяленні Салахлы Казахскага раёна ў сям'і беднага земляроба. У 1920 годзе уступіў у члены Ленінскага комсамола. Праз чатыры годы скончыў настаўніцкую семінарыю ў гор. Казаху, быў выкладчыкам літаратуры ў раённых школах рэспублікі. Вершы Вургун пачаў пісаць з 1926 года. Першы яго верш «Сіняе возера» быў апублікован у азербайджанскай комсамольскай газеце «Малады рабочы». Першая кніга Вургуна—«Клятва паэта» выйшла ў 1930 годзе.

Увесь літаратурны шлях Вургуна — гэта шлях рамантыка-мысліцеля, наватара, сапраўднага песняра вялікай соцыялістычнай эпохі. У паэме «Слова аб калгасніцы Басці» ёсць афарызмы, якія Вургун мог-бы паставіць эпіграфам да ўсёй сваёй дзейнасці.

> Поэт вне жизни — не поэт.
> Поэт вне жизни — пустозвон.

Патрабуючы ад паэта арганічнай сувязі з народам, С. Вургун падкрэслівае, што сапраўдны паэтычны талент можа раскрыцца ва ўсім сваім хараство толькі тады, калі ён карэннямі сваімі ўваходзіць у совецкае жыццё, у совецкую рэчаіснасць. Велізарная сіла Вургуна ў тым і заключаецца, што ён сам актыўны ўдзельнік і будаўнік новага жыцця, жыве ўсімі радасцямі сваёй краіны, усімі інтарэсамі народа і партыі. Паэт чэрпае тэмы сваіх твораў, канкрэтныя вобразы сваіх вершаў і паэм у акружаючай рэчаіснасці, у працы, у барацьбе за соцыялізм.

Паэзія Вургуна вызначаецца высокай вершаванай культурай, багаццем мысляў і свежасцю вобразаў, ідэйнай насычанасцю. С. Вургун—паэт смелых і яркіх вобразаў, смелых абагульненняў, шырокіх асацыяцый. Валодаючы ўсім багаццем нацыянальнай паэзіі, Вургун смела ўводзіць у свой верш нацыянальныя фальклорныя вобразы, метафары і рытмы, напаўняючы іх новым зместам, новымі ідэямі. Гарачая любоў да радзімы, да соцыялістычнай бацькаўшчыны, найглыбейшая адданасць комуністычнай партыі — характэрна для совецкай азербайджанскай лірыкі. Гэтае велізарнае пачуццё асвятляе творы Вургуна. Яно выдатна выказана ў вершы «Азербайджан», які атрымаў шырокую папулярнасць.

Шчырым натхненнем сагрэты вершы паэта, якія паказваюць шырокую карціну соцыялістычнага будаўніцтва квітнеючага Азербайджана. Перад намі праходзяць тонкія пейзажы яго любімай радзімы—квітнеючыя сады Азербайджана, цытрусавыя гаі, чайныя плантацыі Ленкарані, расквіўшыя шоўкам двары Нухі, цудоўныя бавоўняныя палі, якія даюць велізарны ўраджай, Каспій, сытыя статкі, якія пасуцца ў халадку на лугах і на гарах. Любімыя героі—юнакі і дзяўчаты совецкага Азербайджана, якія не ведаюць ні гора, ні журбы. Пачуццё радзімы ў паэта-патрыёта спалучана з вобразамі блізкай яму рэчаіснасці, з адчуваннем каларыта роднай зямлі, якая вырасціла паэта.

> В Ленкорани цветы и свежи и стройны,
> И прекрасны, как женщины нашей страны.
> И амбары колхозные хлебом полны,
> Белый хлопок сияет, как снег на горах,
> Сок лозы виноградной кипит в погребах.

Горды і ўсхваляваны казачным пераўтварэннем сваёй радзімы, яе культурным і гаспадарчым росквітам, паэт заклікае Рафаэля, каб ён сваім цудоўным пэндзлем апісаў новае жыццё Азербайджана.

> Приди, Рафаэль, с дивной кистью творца
> И вспыхнут все краски палитры твоей («Песня шчасця»).

Паэма С. Вургуна «Азербайджан», урыўкі з якой увайшлі ў выданы нядаўна на рускай мове зборнік «Ранішняя песня»,—з'яўляецца адным з лепшых гістарычных твораў паэта. Напісаная малаўніча, эпічна, сакавітай мовай, з глыбокім веданнем мінулага радзімы, яна ахоплівае ўсе найбольш буйныя падзеі шматвяковай гісторыі Азербайджана, пачынаючы ад часоў агнястаклоннікаў да нашых дзён. Гэта эпапея заканчваецца глыбока пафаснымі вершамі аб соцыялістычным будаўніцтве совецкай рэспублікі.

У паэме, прысвечанай гераіні азербайджанскіх калгасных палёў Басці, паэт праніклёна раскрывае лёс жанчыны—рабыні карана і шарыята, жанчыны-азербайджанкі, сумны лёс якой мог зрабіцца і лёсам Басці. Страшнаму свету мінулага, знішчанаму рэволюцыяй, Вургун супроцьстаўляе жыццё совецкай жанчыны—нястомнай, вясёлай працаўніцы-стаханаўкі, якая сваёй мужнай творчай працай выклікае здзіўленне сівога Усхода. «Радостный труд сделал сильной, красивой тебя», «Ты — первый цвет Востока», — гаворыць Вургун.

У радзе сваіх твораў Самед Вургун памастацку адлюстроўвае вобраз правадыра народаў таварыша Сталіна. Выдатныя вершы «Прывітанне правадыру», «На варце сонца», «Слова аб правадыру», «Свабоднае натхненне» і інш. У гэтым цыкле вершаў, насычаных вялікай шчырасцю і непасрэднасцю, паэт стварае велічны вобраз геніяльнага правадыра, вызваліцеля народаў і творца новага жыцця. У «Слове аб правадыру» ён піша:

> В дороге трудной и в труде веселом
> Нам светит мудрый взор любимого отца,
> И слышит вся страна по городам и селам:
> Стучат в его груди народные сердца.
> Мир знает Сталина. Он мудр и человечен.
> Любовью окружил родной народ его,
> Его спокойный взор величием отмечен.
> В любимом имени — народов торжество!

Спалучэнне велізарнага эпічнага размаха з жывым лірызмам, з рэалістычнай глыбінёй вобразаў з'яўляецца адрозніваючай рысай паэтычнага стылю Вургуна. Таму такія яркія, моцныя і ўсебаковыя яго вершы аб правадыру працоўных усяго свету, аб новых людзях, героях нашай краіны. Яго вершы аб Сталіне, бясспрэчна, належаць да лепшых твораў совецкай паэзіі.

Побач з вялікімі і кампазіцыйна ўскладнёнымі палотнамі С. Вургун піша і невялічкія лірычныя вершы на рознастайныя тэмы—аб каханні, аб прыродзе, аб найвялікшым паэтычным геніі Азербайджана Нізамі, аб Пушкіне, аб новых совецкіх людзях—лётчыцах, комсамолках, героях нафты і бавоўны, вырасшых за годы рэволюцыі і соцыялістычнага будаўніцтва. Усё гэта ўвасабляецца ў высокамастацкую форму.

Неабходна адзначыць нядаўна напісаныя Вургуном дзве п'есы «Вагіф» і «Ханлар». Гэта яркія і своеасаблівыя творы, знамянуючыя новы этап у развіцці нацыянальнай драматургіі. У гэтых вершаваных драмах паэт разгарнуў ва ўсім бляску свой прыгожы і яркі талент, з вялікай мастацкай сілай ён адлюстраваў гераічнае мінулае роднага народа, алеў лепшыя, благародныя рысы і ідэалы працоўных.

За апошнія годы азербайджанская паэзія прыцягнула вялікую ўвагу рускіх перакладчыкаў. Совецкая літаратура абагацілася выдатнай кнігай—«Анталогія азербайджанскай паэзіі». Гэта—першае ў гісторыі сусветнай літаратуры манументальнае выданне шматвяковай, рознастайнай паэтычнай творчасці азербайджанскага народа. Шырока прадстаўлен у гэтай анталогіі і Самед Вургун. Сюды ўвайшлі яго творы «Прывітанне правадыру», «Азербайджан», «Свабоднае натхненне», «Слова аб дэпутатцы-калгасніцы Басці», «Памяць». Апрача таго, совецкі чытач можа пазнаёміцца з Самедам Вургуном па яго кнігах, перакладзеных на рускую мову. У мінулым годзе ў Маскве выйшаў зборнік Самеда Вургуна «Ранішняя песня». Выдан зборнік вершаў паэта на рускай мове ў Тбілісі і інш.

Самед Вургун—паэт напружанай філасофскай мыслі, наследнік лепшых традыцый нацыянальнай культуры, гарачы патрыёт сваёй рэспублікі. Нямала натхнёных песень ён прысвяціў вялікай радзіме, роднаму народу.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.